Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МККП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 120 (5794) | 27 мая 1937 г., чацвер | ЦАНА 10 КАП.

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

ПЕРАДАВЫ АРТЫКУЛ — Неадкладна скончыць сяўбу, завяршыць праполку пасеваў.

Тры астатніх самалёты паўночнай экспедыцыі вылецелі на паўночны полюс; самалёт т. Молакава сеў на станцыю «Паўночны полюс».

Каганоўскі — Выконваць рашэнні справаздачна-выбарчых партыйных сходаў.

Рамбаеў — З чаго пачаў работу новы партком.

АБМЕРКАВАННЕ ПЫТАННЯЎ ТРЭЦЯГА ПЯЦІГАДОВАГА ПЛАНА: **Мацэпура** — некаторыя пытанні механізацыі сельскай гаспадаркі; **Мядзведзеў** — Энергетыка і паліваснабжэнне; **М. Робінаў** — Стварыць сыравінную базу для папяровай прамысловасці.

Б. Ліберман — Мурман учора і сёння.

Пачаўся першы тыраж пазыкі другой пяцігодкі.

Адкрыўся совецкі павільён на сусветнай парыжскай выстаўцы.

Парушэнне совецкай граніцы япона-манчжурскім атрадам.

На франтах у Іспаніі;

Германія прадаўжае засылаць мяцежнікам войскі і зброю.

Адкрыўся надзвычайны пленум Лігі Нацый.

НЕАДКЛАДНА СКОНЧЫЦЬ СЯЎБУ, РАЗГАРНУЦЬ ПРАПОЛКУ ПАСЕВАЎ!

Веснавая пасеўная кампанія гэтага года недапушчальна зацягнулася ў нашай рэспубліцы. На 20 мая план веснавой сяўбы выканан толькі на 83,3 проц. Пасеўную кампанію ў рэспубліцы зацягнулі больш як на паўтара месяца, а паўднёвыя раёны расцягнулі яе на два з паловай месяцы.

Раённыя кіраўнікі паранейшаму лічаць у баку ад непасраднага кіраўніцтва сельскагаспадарчымі работамі. Паранейшаму зусім дрэнна пастаўлена палітычна-масавая работа сярод калгаснікаў.

У Лёзнянскім раёне (старшыня РВК т. Шапуроў, сакратар РК КП(б)Б т. Бугроў) далёка не скончана сяўба зернавых і ільну, а пасадку бульбы толькі толькі пачынаюць. Многія калгасы гэтага раёна, не выканаўшы свае планы сяўбы, спынілі работу на полі. Напрыклад, у калгасе «Энергія», Калышанскага сельсовета, недасеяна яшчэ 4 гектары вікі, 5 гектараў аўса і недасаджана гектары бульбы, аднак сяўбу тут спынілі. Такое-ж становішча і ў калгасе «Звязда», Дабрамыслянскага сельсовета. Кіраўнікі Лёзнянічыны не бываюць у калгасах, не бачаць таго, што класавурожыя элементы праводзяць сваю шкодніцкую работу—за недасеў яравога кліна. Не бачаць тт. Шапуроў і Бугроў і таго, што ў калгасах «Рэкорд» (Маўскі сельсовет), «Адказ інтэрвенту» (Чарніцкі сельсовет), імя Галаднеда (Ляшкоўскі сельсовет) праводзяць сяўбу ячменю па-шкодніцку — сеюць зернавыя і лён па зусім неапрацаванай глебе. Аграномы і загадчык Лёзнянскага райземаддзела т. Пастушонак змірыліся з гэтай шкоднай практыкай сяўбы: ў іх прысутнасці калгасы сеюць лён уадпор.

У Уваравіцкім раёне (старшыня РВК т. Ісачанка, сакратар РК КП(б)Б т. Брыман) план сяўбы выканан толькі на 79,2 проц. Тут, напрыклад, не дасеяна яшчэ 1550 гектараў бульбы, недасеяна 1385 гектараў вікі на сена і 820 гектараў канюшыны. Калгас імя Чырвоннага павінен пасадзіць 250 гектараў бульбы, а пасадзіў толькі 30 гектараў. Усяго па раёну не засеяна яшчэ дзесяткі гектараў яравых. Ва многіх калгасах гэтага-ж раёна садзяць бульбу на ненаўгноенай глебе, дапускаюць вялікія агрэхі, змяншаюць норму пасадкі. У калгасе «Прасвет» пасеяна 115 гектараў пшаніцы пратухшым насеннем, у калгасе — пшаніца ўзышла толькі на 25 проц. Калгас «Чырвоная ліпа» засеяў яшчэ 50 гектараў яравых.

Прычына адставання Уваравіцкага раёна тая-ж, што і Лёзнянскага. Уваравіцкім райком партыі і райвыканком саліліся ад кіраўніцтва сяўбой і гэту яго ўсклалі на райземаддзел і МТС. Загадчык-жа райземаддзела т. Гользін і дырэктар МТС т. Данчанка таксама мала бываюць у калгасах, слаба дапамагаюць калгасам, каб хутчэй скончыць веснавую сяўбу.

У Мазырскай акрузе веснавая пасеўная кампанія пачалася яшчэ ў сакавіку, і на сёнешні дзень тут сяўба яшчэ не скончана. Па акрузе звыш дзесяці тысяч гектараў не засеяна яшчэ вікі. План сяўбы проса выканан на 8 проц., а грэчкі ўсяго на 8 проц.

Кіраўнікі некаторых раёнаў імкнуцца скінуць сваю бязрадзейнасць па кіраўніцтве пасеўнай кампаніяй тым, што пінехапае ў калгасах насення і затрымалася сяўба. Такія размовы ідуць, напрыклад, у кіраўніцтве Лёзнянскага раёна. У гэты-ж час калгасы, закончыўшы сяўбу, маюць насення. Напрыклад, у калгасе «Калініна» Калышанскага сельсовета, лішкі насення ільну — 16 цэнтн. Кіраўнікі Лёзнянічыны не падумалі арганізаваць міжкалгасную насеннапазыку. Зусім нецярпімае з'явішча, што на раённых складах Полацкай округі да гэтага часу яшчэ ляжыць шмат адпушчанай дзяржавай насеннай ссуды, якая павінна была быць даўно размеркавана па калгасах.

Неадкладна трэба заканчваць сяўбу яравых! Рашуча весці барацьбу са шкоднымі настроямі. Раённыя партыйныя і совецкія арганізацыі, старшыні райвыканкомаў і сакратары райкомаў партыі павінны прыняць усе меры да таго, каб поўнасцю выканаць план пасеву ў кожным соўгасе, калгасе, брыгадзе. Ніводнага гектара яравога кліна не павінна астацца незасеяным!

Самую рашучую барацьбу трэба павесці з класава-варожымі элементамі, якія імкнуцца пашкодзіць хутчэйшаму і добраякаснаму заканчэнню сяўбы. Патрэбна шырока растлумачыць калгаснікам і калгаснікам, што далейшая затрымка сяўбы, або няхлопкаякаснае яе завяршэнне—толькі на-руку класаваму ворагу, што гэта можа прывесці да страт ураджаю, да паніжэння вагі працадня калгаснікаў.

Трэба памятаць, што своечасова і добраякасна пасеяць—гэта яшчэ далёка не ўсё для таго, каб атрымаць высокі ўраджай. Трэба яшчэ дагледзець, вырасціць пасевы. Значыць арганізацыі праполкі азімых і яравых павінна быць аддана выключна велізарнейшая ўвага.

Аднак, ва многіх раёнах з першых дзён праполачная кампанія пушчана на самацёк. Загадчык Чавускага раённага земельнага аддзела т. Гаўрыкаў не ведае нават як ідзе гэтая работа ў калгасах. А між тым ў калгасах Чавускага раёна вельмі дрэнна арганізавана праполка. Амаль ва ўсіх калгасах Жаліўскага сельсовета калгаснікі працуюць па 30—40 чалавек у адным месцы, зрываюць толькі вярхі пустазелля, а ўвечары брыгадзіры запісваюць працадні ўсім пароўну.

У некаторых калгасах Сенненскага раёна стыхійна, без ніякага кіраўніцтва арганізаваліся праполачныя звенні па 16—20 чалавек. Звенні пачалі палоць толькі лён, а астатнія яравыя і азімыя заглушае пустазелле, і іх ніхто не поліць. Тут таксама існуе ўраўнілаўка ў налічэнні працадзён за праполку. У большасці калгасаў Жлобінскага, Тураўскага, Старобінскага і Чэрыкаўскага раёнаў зусім не прыступілі да праполкі пасеваў.

Неадкладна трэба арганізаваць добраякасны догляд за азімымі і яравымі пасевамі! Нельга дапускаць таго, каб пасевы заглушала пустазелле. Сілы, якія вызваліліся ад сяўбы, трэба неадкладна пераключыць на праполку. Правільна арганізаваць працу на праполачнай, увесці індывідуальную здзельшчыну. Выключную ўвагу—якасці праполкі. Працадні калгаснікам налічваць не толькі ў залежнасці ад колькасных, але асабліва ад якасных паказальнікаў работы на праполачнай. У кожным калгасе павінны працаваць яслі з тым, каб калгаснікі, якія маюць малых дзяцей, мелі магчымасць выходзіць на работу.

Сур'ёзнейшую ўвагу трэба звярнуць на пад'ём папараў. Пастановай урада тэрмін пад'ёму чыстых папараў устаноўлен не пазней 25 мая. Аднак, не гледзячы на тое, што гэты тэрмін прайшоў ужо, ні ў адным раёне рэспублікі не разгарнулі як след пад'ём папараў.

Час зараз вельмі напружаны—трэба заканчваць сяўбу, хутка і добраякасна праводзіць праполку, падпімаць папары і ўжо разгортваць падрыхтоўку да ўборачнай, у першую чаргу да сенакашэння. Ад кіраўнікоў раённых арганізацый патрабуюцца выключна вялікія здольнасці па кіраўніцтву ўсімі гэтымі работамі, умела спалучыць іх з тым, каб ні адна з гэтых работ не выконвалася за лік другой. Правільная расстаноўка сіл, канкрэтнае і аператыўнае кіраўніцтва калгасамі,—вось што забяспечыць поспех у правядзенні веснавых і летніх сельскагаспадарчых работ.

АСТАТНІЯ ТРЫ САМАЛЁТЫ ВЫЛЕЦЕЛІ НА ПАЎНОЧНЫ ПОЛЮС

СТАРТ ДАН 25 МАЯ Ў 23 ГАДЗІНЫ 15 МІНУТ

Галоўнае Кіраўніцтва Паўночнага морскага шляху атрымала з вострава Рудольфа радыёграму аб тым, што астатнія тры самалёты экспедыцыі падняліся 25 мая ў паветра, узяўшы курс на станцыю «Паўночны полюс». Флагманскі карабль «СССР Н-171», пілатуемы Героем Совецкага Саюза тав. Молакавым, стартаваў у 23 гадзіны 15 мінут. Услед за ім стартаваў самалёт «СССР Н-172», кіруемы вядомым палярным лётчыкам Алексеевым. Трэцім падняўся самалёт «СССР Н-169», пілатуемы лётчыкам Мазуруком.

На барту самалёта тав. Молакава знаходзіцца намеснік начальніка экспедыцыі на Паўночны полюс тав. Шэвелеў. Самалёты падтрымліваюць у паветры радыёсувязь з востравам Рудольфа і паміж сабой.

***

Усе гэтыя пяжкія чатырохматорныя караблі абсталяваны таксама, як і карабль Героя Совецкага Саюза тав. Вадап'янава — «СССР Н-170». Палётная вага кожнага самалёта дасягае 24 тон.

(БЕЛТА).

НА ШЛЯХУ ДА ПОЛЮСА

Позна ноччу Галоўнае Кіраўніцтва Паўночнага морскага шляху атрымала наступную тэлеграму ад намесніка начальніка экспедыцыі на Паўночны полюс тав. Шэвелева, які знаходзіцца на флагманскім караблі «СССР Н-171»:

«О гадзін 30 мінут. Паўночны полюс — Шмідту. Масква — Галоўпаўночморшляху. Праляцелі 83 град. 50 мін. паўночнай шыраты. 58 град. усходняй даўгаты. Ясна. Буйныя і многамільныя палі, наделеныя вузкімі шчылінамі.

ШЭВЕЛЕЎ».

САМАЛЁТ ТАВ. МОЛАКАВА СЕЎ НА СТАНЦЫІ „ПАЎНОЧНЫ ПОЛЮС"

МАСКВА, ГАЛОЎПАЎНОЧМОРШЛЯХУ — ЯНСОНУ, БЕРГАВІНАВУ ТАСС, РЭДАКЦЫЯМ «ПРАВДА», «ИЗВЕСТИЯ»

ПАЎНОЧНЫ ПОЛЮС, 26 мая, 7 гадзін 40 мінут. (Радыё). Выляцеўшы 25 мая ў 23 гадзіны 15 мінут з вострава Рудольфа, самалёт «Н-171» Героя Совецкага Саюза тав. Молакава ў 5 гадзін 45 мінут 26 мая быў дакладна над полюсам. Зрабіўшы круг, у 5 гадзін 52 мінуты пайшлі па мерыдыяну 50 градусаў заходняй даўгаты да палярнай станцыі. У 6 гадзін 24 мінуты селі на крыгу станцыі. Упэўненае, без усякіх пошукаў, знаходжанне нашага лагера з'яўляецца здзіўляючым узорам работы тав. Молакава і штурмана тав. Рытсланда. У лагеры велізарная радасць. Астатнія дзве машыны Алексеева і Мазуруку, вылецеўшыя пазней, яшчэ ў паветры.

О. Ю. ШМІДТ.

Над Паўночным полюсам развяваецца сцяг Совецкага Саюза. НА ЗДЫМКУ: камандзір флагманскага карабля «СССР Н-170» Герой Совецкага Саюза тав. М. В. Вадап'янаў (злева) і другі пілот тав. М. С. Бабушкін (справа) атрымліваюць указанні старшэра Цэнтральнага аэрадрома ў Маскве.

Фото Фішмана (СФ).

АЛЕКСЕЕЎ ВЫЛЯТАЕ К НОВАИ ПАЛЯРНАИ СТАНЦЫІ

Учора днём у Галоўным кіраўніцтве Паўночнага морскага шляху атрымана радыёграма намесніка начальніка экспедыцыі на Паўночны полюс тав. Шэвелева, які разам з экіпажам самалёта В. С. Молакава высадзіўся на дрэйфуючай крызе новай палярнай станцыі «Паўночны полюс». У радыёграме гаворыцца:

«Паўночны полюс. 13 гадзін. Алексееў сеў у месцы, дзе зімоўка знаходзілася пазаўчора — шырата 89 градусаў 50 мінут, заходняя даўгата—58 градусаў 30 мінут. Праз дзве гадзіны вылятае да нас. Сувязь з Мазуруком пакуль не ўстаноўлена. Шэвелеў».

(БЕЛТА).

НАЧАЛЬНІКУ ЭКСПЕДЫЦЫІ НА ПАЎНОЧНЫ ПОЛЮС ТАВ. О. Ю. ШМІДТУ КАМАНДЗІРУ ЛЁТНАГА АТРАДА ТАВ. М. В. ВАДАП'ЯНАВУ УСІМ УДЗЕЛЬНІКАМ ЭКСПЕДЫЦЫІ НА ПАЎНОЧНЫ ПОЛЮС

Ленінградская гарадская партыйная канферэнцыя ад імя большэвікоў і ўсіх працоўных горада Леніна шле сваё гарачае прывітанне вам, адважным заваёўцам Паўночнага полюса.

Наша вялікая радзіма ў праве ганарыцца вашым гераічным подвігам, дастойным мужных сыноў совецкай краіны.

Прэзідыум Ленінградскай партыйнай канферэнцыі.

ЗАЯВА ІСПАНСКАГА ВУЧОНАГА

ВАЛЕНСІЯ, 24 мая. (БЕЛТА). Ройо Гомес, геолаг, прафесар мадрыдскага універсітэта, прафесар нацыянальнага музея прыродазнаўчых навук зрабіў карэспандэнту ТАСС наступную заяву:

«Мы,—прадстаўнікі іспанскай навукі, — ведаем, што нагляданні, якія праводзяцца зараз на Паўночным полюсе, маюць велізарнае значэнне для вырашэння навуковых і практычных задач. Нас бясконца цікавяць нагляданні метэаралагічныя, геафізічныя і геалагічныя. Ад усёй душы жадаем экспедыцыі шчасліва і без усякай перашкоды дакончыць свае даследванні».

Галоўнае кіраўніцтва Паўночнага морскага шляху, *Янсону*

Паўночны Полюс, 26 мая, 19 гадзін 30 хвілін (радыё). Як вы ведаеце з данясення Дзіксона, востраў Уедзінення чуў Р К у 5 гадзін 30 хвілін і ў 5 гадзін 43 хвіліны. Значыць, Мазурук ужо ў раёне полюса і прытым, як ён паведаміў, «усё ў парадку».

Не сумняваюся, што самалёт сеў гэтак-жа добра, як Р А, маючы такіх таленавітых і вопытных вадзіцеляў, як Мазурук і іншыя з ім у гэтым палёце Казлоў. Відаць, у іх не ладзіцца з радыёработай, бо няма спецыяльнага радзіста, а толькі штурман-радзіст, што не адно і тое-ж.

Зараз ва ўсім раёне полюса пурга, палёты немагчымы. Нават прылёт Алексеева адменен. Будзем спакойна чакаць. Калі надвор'е палепшыцца, то, пасля прылёту Алексеева, усімі самалётамі абшукаем трыкутнік паміж полюсам, 60 град. заходняй даўжыні, 70 град. усходняй даўжыні і 89 град. 30 мін. шыраты. Не сумняваюся, што знойдзем, хаця, можа быць, не адразу.

ШМІДТ.

***

Р К — умоўнае абазначэнне самалёта Мазурука, Р А — самалёта Алексеева.

Не толькі пасеяць, але і добра дагледзець і вырасціць пасевы

ГОРАЦКІЯ КІРАЎНІКІ ДЭМАБІЛІЗАВАЛІСЯ

У Горацкім раёне панує настрой, што сяўба нібыта скончана і можна адпачыць. Гэта шкодная самасупакоенасць назіраецца нават у тых калгасах, дзе план сяўбы яшчэ далёка не выканан.

Узяць хоць-бы буйнейшы ў раёне калгас «Ленінскі шлях», Варашылаўскага сельсовета. Тут вялікі недасеў многіх зернавых культур, пасадка бульбы разгортваецца зусім слаба. Аднак работа на полі амаль спынілася, праўленне калгаса не мабілізавала калгаснікаў на поўнае і хутчэйшае скончанне сяўбы.

Большасць сельсоветаў раёна, хаваючыся за сярэднімі лічбамі, недапушчальна зрываюць выкананне плана. Калгасы Варашылаўскага сельсовета засеялі ўсяго 78 проц. зернавых, а ільну — 93 проц., Ленінскага — 81 проц. усіх яравых, Каменскага — 85 проц., Макараўскага — 88 проц. Сяўбу ільну да гэтага часу не скончылі ў пераважнай большасці калгасаў раёна.

На 20 мая ў раёне па калгасна-сялянскаму сектару план сяўбы яравых выканан толькі на 91,9 проц. Апошняя пяцідзёнка дала прырост не больш, чым на 2 проц. Аднаасобнікі засеялі яравых толькі на 71 проц.

Раённыя арганізацыі самасупакоіліся, не мабілізаваліся самі і не мабілізавалі калгаснікаў на скончанне сяўбы ў кожным калгасе, брыгадзе. Работнікі земельнага аддзела прама заяўляюць, што план поўнасцю не будзе выканан. Яны матывуюць гэта тым, што ў калгасах нехапае насення.

Але што зрабілі ў раёне па мабілізацыі ўнутрыкалгасных насенных рэсурсаў? Калгасная насенная пазыка арганізавана слаба. Ёсць рад калгасаў, дзе план выканан і астаюцца лішкі насення. Аб гэтым заяўляе, напрыклад, калгас «Першамай». Тут пасля скончання сяўбы засталося 100 пудоў насеннай яравой пшаніцы і шмат ячменю.

Дэмабілізацыя раённых арганізацый, самасупакоенасць ствараюць пагрозу поўнаму скончанню сяўбы ў кожным калгасе, брыгадзе.

А. ПОСЬ

ПУСТАЗЕЛЛЕ ЗАГЛУШАЕ ПАСЕВЫ

ЧАВУСЫ. Дажджы і цёплае надвор'е спрыяюць росту азімых і яравых. Раней пасеяны лён вышаў у ёлку і на асобных участках дасягае 10—12 сантыметраў. Азімае жыта пачало каласіцца, у асобных калгасах яно дасягае росту 100—120 сантыметраў пры даўжыні коласа ў 8—10 сантыметраў. Азімая пшаніца выходзіць у трубку. Яравыя, як авёс, ячмень, дасягаюць росту 8—10 сантыметраў.

Такі рост пасеваў абавязвае старшынь калгасаў, а таксама раённы земельны аддзел і машынатрактарную станцыю яшчэ больш узмацніць барацьбу за вырошчванне багатага ўраджаю. Аднак, старшынь калгасаў, як і работнікаў райземаддзела (загадчык Гаўрыкаў) і машынатрактарнай станцыі (дырэктар Жалезнякоў) пустазелле апярэдзіла. У раёне звыкліся ўсе сельскагаспадарчыя кампаніі праводзіць па чарзе. Покуль тут надумаюцца арганізаваць праполку, то гэтым часам пустазелле ўзнімецца вышэй пасеваў яшчэ на некалькі сантыметраў.

На палях Антонаўскага, Прудкоўскага, Благаўскага і іншых сельсоветаў дзе-ніадзе можна бачыць жанчын на праполцы, а 22 і 23 мая ў большасці калгасаў зусім не працавалі. 22 многія калгасы святкавалі рэлігійнае свята «Ніколу», а 23, як правіла, выходны дзень.

Перадавыя калгасы прапалолі ўжо сотні гектараў, але ў райземаддзеле аб гэтым ведаюць толькі па расказах. Як ідзе праполка — раённыя работнікі не ведаюць. Загадчык райземаддзела тав. Гаўрыкаў скардзіцца, што калгасы Жаліўскага сельсовета пачалі праполку, але работа не арганізавана, жанчыны працуюць па 40 у адным месцы, зрываюць толькі верхавінкі пустазелля, а вечарам брыгадзіры працадні запісваюць усім пароўну.

Хто, як не райземаддзел і машынатрактарная станцыя, павінны заняцца арганізацыяй працы, устанаўленнем норм і аплата на праполцы. Аднак, Гаўрыкаў і Жалезнякоў не адчуваюць адказнасці, якую яны нясуць роўна з старшынямі калгасаў за булучы ўраджай.

У раёне захапляюцца рэкордным участкам ільну калгаса «Юны комунар». Сапраўды, лён тут расце надзіва—роўны і густы. Але грош цана захапленню, калі гэтыя ўчасткі пакрыты сурэпкай і пырнікам. Горш таго, участак ільну навокал агароджан валам пырніку, які пры апрацоўцы глебы складалі і да гэтага часу не звезлі. Пырнік і свірэпка на гэтым валу пачалі прарастаць.

У калгасе «Новае жыццё» праполка пачалася, але жанчыны, якія маюць малых дзяцей, на работу не выходзяць. Яслі да гэтага часу не адкрыты. Жанчыны атакоўваюць старшыню калгаса Гарбаценка, падштурхоўваюць яго хутчэй адкрыць яслі, а той адказвае:

— Чаго вы спяшаецеся, праполка-ж толькі пачалася?!..

Ці не думае Гарбаценка адкрыць яслі ў канцы праполачнай? Не асабліва спяшаецца ён і з арганізацыяй звенняў на праполцы. Фармальна звенні ў калгасе ёсць, але ўчасткі за імі не замацаваны.

Такое-ж становішча і ў калгасе «Першы май», Прудкоўскага сельсовета. Яслі не адкрыты, якасць праполкі дрэнная. Праполатая азімая пшаніца з-за жыта не відаць, якое асталося ў пшаніцы пасля праполкі.

Пры цяперашнім цёплым надвор'і і частымі тут дажджамі пустазелле апярэджвае ў росце пасевы. Ні райза, ні МТС да гэтага часу пытаннямі арганізацыі праполачнай не займаліся. Не спяшаюцца яны і зараз, калі без іх удзелу пачалася праполка.

Раённыя арганізацыі, захапіўшыся добрым ростам пасеваў, не бачаць злейшага ворага ўраджаю — пустазелля, з якім ужо зараз трэба весці неадкладную барацьбу.

Д. МАЛЕВІЧ.

ЗАЦЯГВАЮЦЬ ПАСАДКУ БУЛЬБЫ

Калгасы Кармянскага раёна павінны пасадзіць 8.110 гектараў бульбы. Да апошняга часу за пасадку бульбы яшчэ амаль не прыніміліся.

Асабліва адстаюць калгасы Хізаўскага, Кароцькаўскага і Ворнаўскага сельсоветаў. Калгас «Чырвоны Сормаў», Барсукоўскага сельсовета, замест 94 гектараў па плану, пасеяў толькі 15. Тут галоўнай прычынай адставання з'яўляецца дрэнная арганізацыя працы. Калгаснікі і асабліва жанчыны не мабілізаваны на пасадку бульбы. Усіх працаздольных жанчын — 60 чал., а на работу выходзіць толькі 20 — 25. У калгасе дагэтуль не адкрыты яслі, што адбіваецца на становішчы працоўнай дысцыпліны.

Такое становішча і ў калгасах «Комінтэрн», «Зара Беларусі», «Звязда», «Парыжская Комуна» і інш.

Не на многа лепш праходзіць сяўба зернавых культур. Калгаснікі не мабілізаваны на хутчэйшае і поўнае заканчэнне сяўбы ўсіх яравых культур. У тых-жа Кароцькаўскім і Хізаўскім сельсоветах асобныя калгасы засеялі толькі 50 проц. зернавых.

І. КАВАЛЁЎ.

ЖАНОЧЫ ТРАКТАРНЫ АТРАД

Трактарны атрад дзяўчат Пялушскай машынатрактарнай станцыі на веснавых палявых работах заняў першае месца па станцыі. У перавозе на мяккае ворыва ўсе яго тры трактары далі па 162 гектары.

План палявых работ брыгада выканала на 130 проц. Радковая сяўба перавыкананa на 35 гектараў.

Усе работы брыгады прымаюцца калгасамі на выдатна і добра.

Л. ПУТЫРСКАЯ.

У ЎСЕБЕЛАРУСКАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ АРХІТЭКТАРАЎ

Пра з раніцы на канферэнцыі архітэктараў БССР быў заслуханы даклад начальніка архітэктурна-планіровачнага кіраўніцтва віцебскага горсовета т. Брэгмана аб архітэктурна-будаўнічай практыцы ў БССР. Брэгман асцярожна і з аглядкаю гаварыў аб скажэннях у архітэктуры, але назваў прычыны, не паказаў канкрэтных віноўнікаў зла.

У канферэнцыі архітэктараў неаднаразовыя разгорнутыя спрэчкі на падставе даклада праўлення саюза і па дакладзе архітэктурна-планіровачнай практыцы БССР. Спрэчкі прадаўжаліся ўвесь дзень. Тт. Маклянова, Гуліла, Кірыленка, Ціхан і інш. гаварылі аб адарванасці ад мас, аб адсутнасці сістэматычнай дапамогі архітэктараў, аб тым, што саюз не займаўся вылучэннем маладых кадраў архітэктараў. Праўленне і яго старшыня Амбражунас адарвана ад архітэктурнага асяродзя і не ведае творчага жыцця членаў саюза.

Тав. Глейберман (Белкомунбуд) гаварыў аб тым, што архітэктары не прымаюць удзелу ў ажыццяўленні іх праектаў, і паставіў у прыклад архітэктара т. Лангбарда, які заўсёды прымае ўдзел у ажыццяўленні сваіх архітэктурных замыслаў на пабудове.

Усяго за ўчарашні дзень выказалася 17 чалавек. У канцы вячэрняга пасяджэння з прамоваю выступіў намеснік старшыні СНК БССР т. Любовіч.

Сёння прадоўжацца спрэчкі па дакладах.

Н. ГАРНЫ.

ХОД ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ ПА СССР

На зводкі Наркамзема, Наркомсоўгаса, Наркамхарчпрома СССР аб ходзе веснавой сяўбы на 20 мая засеяна па СССР 79.416 тысяч гектараў, што складае 85 проц. плана.

На 15 мая было засеяна 72.797 тысяч гектараў—78 проц. плана. Такім чынам адстае па сяўбе за пяцідзёнку складае 6 проц.

У мінулым годзе на 20 мая было засеяна яравых 80.611 тысяч гектараў — 86 проц. плана.

Зголна агульнасаюзнай зводкі па Беларускай ССР засеяна яравых 2.022 тысячы гектараў, што складае 84 проц. плана. У тым ліку калгасы засеялі 1.836 тысяч гектараў, аднаасобныя сялянскія гаспадаркі — 91 тысячу гектараў, соўгасы — 95 тысяч гектараў.

Закончылі веснавую сяўбу Кабардзіна-Балкарская АССР, Орджанікідзеўскі край, Калінінская і Оранбургская вобласці. Набліжаюцца да завяршэння веснавой сяўбы Азова-Чорнаморскі край і Сталінградская вобласць.

ВЫКОНВАЦЬ РАШЭННІ СПРАВАЗДАЧНА-ВЫБАРЧЫХ ПАРТЫЙНЫХ СХОДАЎ

Справаздачна-выбарчы сход у партыйнай арганізацыі магілеўскага скурзавода імя Сталіна праходзіў з высокай актыўнасцю комуністаў, на прынцыпова-ідэйным палітычным узроўні, з жорсткай крытыкай і самакрытыкай недахопаў у партыйна-палітычнай рабоце.

Сход прапанаваў новаабранаму парткому ў сваёй практычнай рабоце строга выконваць рашэнні лютаўска-сакавіцкага Пленума ЦК ВКП(б), правесці рад мерапрыемстваў у галіне паляпшэння прапаганды і агітацыі і вырошчвання партыйных кадраў.

З часу справаздачна-выбарчага схода прайшло паўтара месяца. Як-жа выконваюцца яго рашэнні? Трэба з усёй сур'ёзнасцю сказаць, што зроблен толькі нязначны пачатак. Так, напрыклад, зараз кожны член парткома мае ўчастак партработы, за які ён адказвае перад партарганізацыяй. Раней гэта адсутнічала. Была абязлічка ў партыйнай рабоце. У выніку маса партыйцаў бачыла толькі сакратара парткома, а астатнія члены партыйнага камітэта не ўцягваліся ў актыўную партыйную работу.

Мы перагледзелі калектыў палітагітатараў і рэзерв да яго. Калі раней рэзерв быў абязлічан, прысутнасць яго на семінарах была не абавязкова, то зараз кожны рэзервнік мае пэўны ўчастак прапагандысцкай работы, вывучае запатрабаванні аўдыторыі і яе палітычны ўзровень. Узнялася якасць семінараў, якія своечасова падрыхтоўваюцца і праводзяцца на высокім палітычным узроўні.

Многія члены і кандыдаты партыі ў нашай партарганізацыі мелі шмат партдаручэнняў, а некаторыя — нічога. Так, т. Яро быў старшынёй бюро ІТС, старшынёй дэпутацкай групы завода і рад іншых. Партком аслабаніў т. Яро ад лішніх даручэнняў. Зараз мы вырашчваем новы актыў. Прыцягваем да работы беспартыйных, якія добрасумленна выконваюць свае абавязкі. Так, беспартыйнага інжынера Негінскага абралі старшынёй бюро ІТС.

Партком звярнуў сур'ёзную ўвагу на кіраўніцтва заводскім друкам, заслухоўвалі рэдактароў насценных газет і некаторых начальнікаў цэхаў аб становішчы рэагавання на сігналы друку. Члену партыі т. Ваксману (дырэктар базіснага склада) партком вынес папярэджанне за ігнараванне сігналаў друку, а т. Месенгісеру (начальнік аддзелачнага цэха) указалі на неабходнасць адказваць на запытанні газет.

Гэтымі днямі праведзен партыйны сход па пытанню праверкі выканання рашэнняў справаздачна-выбарчага схода. Першы падобны сход за доўгія гады. І што-ж? Члены і кандыдаты партыі ўказвалі нам, што партком выканаў толькі частку таго, што было даручана. Работа са спачуваючымі астаецца на зусім ніжэйшым узроўні. Адсутнічае належная работа па ўцягненню перадавых рабочых у рады спачуваючых. Недастаткова ахоплены яшчэ палітагітацыяй рабочыя асноўных пэхаў. Справаздачна-выбарчы сход патрабаваў ад парткома паляпшэння кіраўніцтва профсаюзнай арганізацыяй. Аднак мы гэтага не зрабілі, хаця тэрміну было больш, чым дастаткова. На ўсё гэта комуністы ўказалі нам яшчэ раз у сваіх выступленнях, патрабуючы неадкладнага выканання рашэнняў лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б).

Сакратар парткома магілеўскага скурзавода імя Сталіна

КАГАНОЎСКІ.

СХОД АКТЫВА ВЕРХСУДА БССР

Сталінская Канстытуцыя пацягнула за сабой карэнную перабудову работы органаў совецкай юстыцыі. Ад Наркамюста аддзялілася пракуратура, а суд стаў асноўнай галіною работы наркамата. Рэспубліканская нарада актыва органаў юстыцыі, якая скончылася 25 мая ў Менску, паказала, аднак, што ў БССР гэта перабудова значна спазняецца. Наркамюст БССР яшчэ не павярнуўся па-сапраўднаму тварам да народных судоў. Судовыя работнікі былі заражаны ідыёцкай хваробай— палітычнай бесклапотнасцю. У судовыя органы пранікліі трацкісты і дыверсанты. У Вярхоўным судзе БССР іх аказалася 7 чалавек, але ніхто іх не змог выкрыць, хоць пільнасці ў судовых органах павінна быць больш, чым дзе-б там ні было.

У Канстытуцыі запісана, што асноўная задача суда — бязлітасная барацьба з ворагамі народу. А народныя суды раду раёнаў рэспублікі вельмі дрэнна ажыццяўляюць гэты пункт Канстытуцыі. Барысаўскі суддзя Міхневіч вынес апраўдальныя прыгаворы па чатырох справах аб контрэволюцыйнай дзейнасці трацкістаў.

Нарком юстыцыі БССР тав. Кудзельскі вымушан быў у сваім дакладзе на актыве прызнаць, што ёсць факты, калі людзі незаконна пазбаўлены волі, або пераседжваюць доўгія тэрміны. У Горацкім раёне, напрыклад, суд прыгаварыў ні ў чым невіноўнага грамадзяніна Якаўлева Фёдара да 5 год пазбаўлення волі. Прыгавор быў потым адменен, а пакуль гэта «памылка» была выпраўлена, чалавек адсядзеў два гады. Такія-ж выпадкі былі ў Церахоўскім раёне.

Адным з каварных метадаў трацкісцкіх бандылаў з'яўляецца кампраметацыя чэсных работнікаў. Маладых нявопытных кіраўнікоў заводзілі да лавы падсудных. Гэты «метад» зараз выкрыт. Але які вывад зрабілі для сябе судовыя органы? Ні Наркамюст, ні Вярхоўны суд, ні народныя суды не праверылі ўсе прайшоўшыя працэсы, каб выявіць сапраўдную віноўнасць раду асуджаных. Між тым такія праверкі даюць вялікую карысць. У Магілеве, калі накапаліся ў старых справах, выкрылі вялікую групу трацкістаў-дыверсантаў, якія атруцілі на магілеўскай шаўковай фабрыцы некалькі дзесяткаў рабочых. 16 арыштаваных па гэтай справе трацкістаў прызналіся ў гэтым злачынстве.

Вораг народу Пашуканіс, аўтар раду шкодніцкіх «тэорый», па падручніках якога «рыхтаваліся» юрыдычныя кадры, знайшоў у БССР паслядоўцаў. «Тэорыі» Пашуканіса адлюстраваліся ў асобных працах навуковых работнікаў Акадэміі навук БССР і юрыдычнага інстытута Наркамюста (Галанза, Гохман, Канаплін, Рудзіцкі, Гаузэ).

Дацэнт Гохман, выступаючы на актыве з пакаяннай прамовай аб сваіх памылках, паглыбіў іх.

Гаворачы аб сваіх былых памылках, Гохман успамінае: «Мы» (ён так і не растлумачыў актыву, каго ён падразумяваў пад гэтым «мы») лічылі, што закон— гэта ёсць «нігіль»—нічога»...

Не дзіўна, што выступленне Гохмана выклікала абурэнне ўсяго актыва. Адхарваному ад мас дацэнту прышлося выслухаць суровыя словы асуджэння ад сваіх уласных вучняў.

Слаба крытыкавалі на актыве работу Наркамюста і Вярхоўнага суда рэспублікі. Ні дакладчык т. Кудзельскі, ні выступаўцы ў спрэчках не ўзялі пад сур'ёзную большэвіцкую крытыку работу гэтых органаў. Мімаходам толькі ўпамянулі аб дрэнній рабоце інструктароў і рэвізораў наркамата і касацыйнай калегіі.

У сваёй рэзалюцыі актыў адзначыў, што ўвага судовых работнікаў не была накіравана на вялікія палітычныя пытанні, яны забылі, што Совецкі Саюз знаходзіцца ў абстаноўцы капіталістычнага акружэння. Гэта прывяло да таго, што ў Вярхоўным судзе, у Барысаўскім, Аршанскім і іншых народных судах не здолелі разгледзець твар класавага ворага. Актыў таксама адзначыў уплыў шкодніцкіх «тэорый» Пашуканіса на працы раду работнікаў юстыцыі рэспублікі і ў практыцы работы асобных суддзяў.

* * *

У рабоце рэспубліканскага актыва прымала ўдзел 150 чалавек. Сярод іх былі народныя суддзі, судовыя выканаўцы, натарыусы, абаронцы, інспектары і рэвізоры

І. ЦЫВЕС.

Растратчыкі і іх апекуны

Доўгі час тарфяны завод «Асінторф», Аршанскага раёна, знаходзіцца ў цяжкім фінансавым становішчы. Тут увайшло ў сістэму — зарплата рабочым і служачым выплачваецца са спазненнем на 2—3 месяцы. Прычын гэтаму далёка шукаць не трэба.

Галоўным бухгалтарам па заводзе працуе нейкі Ламака. У мінулым годзе ён са старшым бухгалтарам 4 участка Чарпатовым растраціл каля 36 тыс. рублёў заводскіх грошай. Каб утоіць сляды свайго злачынства, яны ідуць на ўсякія жульніцкія махінацыі. 4 лютага Ламака спісвае гэтыя грошы ў страты 1936 года, быццам-бы грошы выдаткаваны на «нявысветленыя авансы». Прычым — з іх 10.000 рублёў уносіць на баланс 1937 года, г. зн. мяркуе спісаць на страты другога года.

Я, як старшы бухгалтар, аб усім гэтым расказаў дырэктару завода Шульгоўскаму, але ён заняў пазіцыю неўмяшання. Ламака, карыстаючыся гэтым момантам, выклікае мяне да сябе ў габінет і пачынае пагражаць:

«Ты за гэта абальешся крывавымі слязьмі». Я напісаў заяву старшыні тарфкома Эстрыну, дзе таксама аб гэтым расказаў. Але дарэмна. Як для дырэкцыі, так і для тарфкома растратчык Ламака даражэй, чым дзяржаўныя сродкі. Інакш нельга растлумачыць той факт, што расследванне па гэтай справе даручылі таму-ж самаму Ламаку.

Вось як на Асінторфе выяўляюць растратчыкаў сацыялістычнай уласнасці. Палітычная бесклапотнасць і сямейственасці тут глыбока ўкараніліся ў кіраўніцтве завода.

ІВАНЕКА.

Злачынцаў—да судовай адказнасці

Станцыя Церахоўка размешчана ў 40 кілометрах ад Гомеля, дзе знаходзіцца кіраўніцтва Беларускай чыгункі. Але яна ўпарадкавана горш, чым які-небудзь закінуты раз'езд або блок-пост. Уначы станцыя не асвятляецца нават тады, калі прыбываюць пасажырскія паязды. Пасадка і высадка пасажыраў праводзіцца ўпотэмку.

Абслугоўванне пасажыраў паязднымі праваднікамі вельмі дрэннае. Яны нават не лічаць патрэбным паведаміць да якой станцыі падыходзіць поезд. У выніку гэтага ёсць няшчасныя выпадкі.

26 красавіка на ст. Церахоўка ў 21 гадзіну прыбыў поезд № 208. У некаторых вагонах не было святла. Пасажыры не былі паведамлены праваднікам, што гэта станцыя Церахоўка, а поезд стаіць тут усяго тры мінуты. Не паспелі яшчэ людзі сысці, як поезд пайшоў. Апошняя вышаўшая з вагона калгасніца Булавіна упала пад кола вагона. Дазорны кандуктар нават не даў сігналу аб няшчасным выпадку. Булавіна была пакінута адна на рэйках.

Праз некалькі мінут на месца здарэння з'явілася адміністрацыя станцыі. Каб замесці сляды злачынства, яны выклікалі кантору пасажыраў, якія ехалі разам з Булавінай і спрабавалі напісаць фальшывы пратакол аб няшчасным выпадку, быццам-бы Булавіна ішла каля поезда і ўпала пад яго. Але-ж калгаснікі-пасажыры адмовіліся падпісаць гэты «дакумент».

Калгасніца Булавіна была адпраўлена першым поездам у Гомель у вузлавую больніцу, але па дарозе яна памерла.

Канкрэтных віноўнікаў забойства чалавека неабходна прыцягнуць да судовай адказнасці.

ГРЗК.

З ЧАГО ПАЧАЦЬ РАБОТУ НОВЫ ПАРТКОМ

Калінкавіцкі вузлавы партыйны камітэт выбран 10 красавіка. Значыць, партком працуе больш месяца. Што-ж здолеў зрабіць партыйны камітэт за гэты час?

Трэба сказаць, што пры маёй справаздачы, як сакратара парткома службы руху, работа парткома падверглася самай суровай, моцнай крытыцы. І зараз прапановы комуністаў паложаны ў аснову складання плана работы, у рэзультаце чаго мы склалі канкрэтны план на частку красавіка і май месяцы. Прычым, рашылі пасяджэнні парткома рабіць два разы, вузлавыя партыйныя сходы — адзін раз у месяц.

У плане 16 пытанняў партыйна-палітычнай работы і 4 гаспадарчыя. У мінулым-жа было наадварот. Далей, вузлавы партком рашыў, што ўсяму вузлу неабходзен календарны план-графік работы ўсіх гаспадарчых, партыйных, профсаюзных і комсамольскіх арганізацый. Гэтым спыніўся самацёк. Зараз усе ведаюць, хто што робіць кожны дзень.

Партком арганізаваў палітычную вучобу беспартыйных камандзіраў, ім адведзена 6 дзён па 2-паточнай сістэме, правялі двое заняткаў па дакладу таварыша Сталіна, якраз прыгадзіўся нам нанава арганізаваны парткабінет. Камандзіры займаліся з задаваленнем. Утульна, светла, усё пад рукамі. Як новавыбранаму партыйнаму органу, нам далі аслабанёнага прапагандыста. Значыць, першыя крокі ў палітычнай вучобе сярод камандзіраў-беспартыйных зроблены.

Далей. Вузлавы партком пачаў пры парткабінеце сістэматычна збіраць чытчыкаў-бяседчыкаў вузла, ужо праведзены семінары па дакладу таварыша Сталіна, аб задачах парткалектыва, аб міжнародным становішчы, аб Дню друку.

Цяпер я азнаёмлюся з комуністамі ўсіх первічных партарганізацый вузла. Ужо ўзнаў многіх. Раней я іх не ведаў амаль зусім. Значыць, стала больш калектыўнасці ў рабоце і цясней сувязь з парткомамі. Цяпер Мазырскі райком таксама пачынае больш цікавіцца жыццём партыйных арганізацый.

Крушэнні па станцыі Калінкавічы былі ў выніку таго, што мы не ведалі людзей. Вядома, што шайка шкоднікаў працавала ў дэпо. Вузлавому парткому многа яшчэ прыдзецца папрацаваць над ліквідацыяй вынікаў шкодніцтва.

Партыйны камітэт паставіў задачу: кожнаму члену парткома абавязкова мець партыйныя даручэнні на таму ці іншаму пытанню. Да гэтага часу большасць пытанняў я браў на сябе. Цяпер будуць нараўне са мной адказваць члены парткома за той ці іншы ўчастак работы.

Якія недахопы? Па-першае, новавыбраныя сакратары камітэтаў, Раманаў — служба шляху і Гурар'е — служба руху, не ўзяліся за работу як належыць, і з пашага боку няма належнай дапамогі. Не ведаем мы яшчэ тэхнікі, структуры вузлавых парткомаў. Да гэтага часу няма добрага памяшкання, дзе можна было-б працаваць.

Дапамога, і вельмі вялікая, на першых парах трэба нам ад палітаддзела, паколькі нашы органы новыя, створаныя ў апаведнасці з рашэннем Пленума ЦК ВКП(б), якія закліканы для апаратыўнага правядзення іх у жыццё.

РАМБАЕЎ.

Сакратар парткома Калінкавіцкага вузла.

НА АКТЫВЕ РАБОТНІКАЎ СУВЯЗІ

На ўчарашнім паседжанні многія выступаючыя гаварылі аб палітычнай бесклапотнасці работнікаў кіраўніцтва сувязі, аб засмечанасці апарата, пра што т. Паўлаў не палічыў патрэбным далажыць актыву.

Начальнікам радыёаддзела працуе комуніст Зорын, які патураў шпіёну, дыверсанту Клімантовічу. З Жыткавіцкага раёна паступалі неаднаразовыя сігналы аб тым, што гэты вораг скарыстоўвае радыёвузел у шпіёнскіх мэтах. Што-ж робіць Зорын? Ён перакідвае гэтага «спеца» ў другі раён — Бярэзінскі, зноў-такі загадчыкам радыёвузла, дзе яго праз месяц выкрылі. Гэты выпадак не адзінкавы.

У Чэрыкаве доўгі час працаваў загадчыкам радыёвузла прайдзісвет Еўдакімаў, які сарваў перадачу даклада таварыша Сталіна на VIII Надзвычайным Усесаюзным з'ездзе Советаў.

Аб усіх гэтых людзях Зорын добра быў асвядомлен, але чамусьці пашкадаваў свае «кадры».

І вось перад актывам выступае Зорын. У выглядзе пакрыўджанага школьніка, ён апеліруе сходу, што радыёаддзел у загоне. На шматлікія рэплікі з залы, каб ён расказаў аб патуранні шпіёнам, ён, нарэшце, выказаў: «Гэта наша агульная віна». Такавы справы «начальніка» адпаго з важнейшых аддзелаў кіраўніцтва сувязі.

Дасталося і начальніку не менш важнага паштовага аддзела Мухіну. Мухін усю работу перадаверыў заяўдаму бюракрату Некрасаву, да якога цяжка даступіцца. А паштовы аддзел працуе горш за ўсіх. У раённых паштовых аддзяленнях месяцамі не бывае марак, адкрытак, канвертаў. Дастаўка газет у глыбінныя раёны пастаўлена выключна дрэнна. Іх чытаюць там на пяты-шосты дзень. Тысячы скаргаў працоўных на дрэнную работу пошты астаюцца без рэагавання.

Выступае сам Мухін. І зноў паўтараецца старая гісторыя: паштовы аддзел крыўдзяць, усю ўвагу — тэлеграфу і тэлефону. Бедны Мухін, яму ўсе перашкаджаюць! Чым ён займаецца — невядома. Дарэчы, ён-жа з'яўляецца сакратаром парткома, але, на жаль, Мухін не ведае, што робіцца ў апараце кіраўніцтва. Удалося-ж атрымаць партбілет ворагу народу Матусевічу, якога ўзялі пад апеку работнікі кіраўніцтва Альфонскі, Тарасевіч.

Тав. Шульман (загадчык бюро скарг) расказаў, што за 4 месяцы паступіла ў кіраўніцтва сувязі 2.993 скаргі і ўсё— на дрэнную работу пошты.

Начальнік менскага паштамта т. Кадушын умудрыўся ў сваёй прамове ні словам не ўпамянуць аб рабоце паштамта.

Выступаючыя прыводзілі шмат фактаў з «дзейнасці» былога ўпаўнаважанага Валодзька. Валодзька здзекваўся над людзьмі, развраліў усю работу сувязі.

Трэба адзначыць, што некаторыя прамоўцы займаюцца палітычнай трасакатнёй (Жалезнякоў—Слуцк), не выкрываюць недахопы ў рабоце, кідаюць агульныя фразы.

І. ТУРЭЦКІ.

Бяздушныя адносіны да рабочых

Дырэктар племгаса імя Калініна, Менскага раёна, Давідовіч груба парушае Сталінскую Канстытуцыю, заціскае крытыку і самакрытыку, бяздушна адносіцца да рабочых. Вось факты, якія ярка сведчаць аб гэтым.

Стаханаўка — даярка тав. Віхрова напісала заметку ў «Совхозную газету» аб няправільным звальненні аднаго рабочага з соўгаса. Давідовіч даведаўся аб гэтым, ускрыўшы пісьмо, якое рэдакцыя газеты адрасавала на імя Віхровай. На вытворчай нарадзе Давідовіч абвінаваціў стаханаўку ў плётках і нават прыпісаў ёй шкодніцтва, пагражаючы знятцем яе з работы.

Стаханаўка Віхрова скардзіцца ў камітэт саюза рабочых малочна-мясных соўгасаў. Саюз выклікае ў Менск на пасяджэнне прэзідыума дырэктара Давідовіча, старшыню рабачкома Гумашыка і Віхрову. Але самадур зноў папярэджвае даярку, што калі яна паедзе ў Менск, ён зніме яе з работы. Сам-жа не палічыў патрэбным з'явіцца на пасяджэнне прэзідыума і не пусціў старшыню рабачкома. Усё-ж на пасяджэнне Віхрова паехала. Але праз дзень пасля пасяджэння Віхрова знімаецца з работы.

Дырэктар Давідовіч груба парушае профсаюзную дэмакратыю. Без яго дазволу рабачком не мае права склікаць агульныя сходы рабочых. Беспакарана парушаецца і працоўнае законадаўства. З паступленнем веснавой сяўбы Давідовіч з 10 красавіка па 1 мая адмяніў у соўгасе выхадныя дні і ўвёў замест 8-гадзіннага — 10-гадзінны рабочы дзень. Канторы даў распараджэнне аплачваць звышчасовую работу не ў палутарным, а ў ардынарным размеры.

Адносіны да рабочых з боку дырэктара Давідовіча яўна барска-сапоўныя.

6 красавіка здарыўся такі выпадак. Давідовіч з старшым конюхам Шымчукам ехаў з Менска ў соўгас на конях. Лошыцай яны нагналі работніцу соўгаса Белую, якая шла з двума малымі дзецьмі. Убачыўшы дырэктара работніца пачала прасіць пад'ехаць. Дырэктар адмовіў.

У соўгасе няма клопатаў аб жыллі людзях. Кватэры рабочых не адраманты ны. Дровы і бульбу рабочыя трымаюць пакоях, там дзе і спяць. На ўсякія заявы гі рабочых Давідовіч не звяртае ніякай увагі, ён зусім не прыслухоўваецца з голасу рабочых і работніц соўгаса, гр адносіцца да ўсіх.

Усе гэтыя факты патрабуюць самай сур'ёзнай увагі. Самадура Давідовіча трэба заклікаць да парадку.

С. КУДЗІНАЎ.

На „Комунарцы" тэхнікай безапаснасці не займаюцца

У нас на фабрыцы «Комунарка» (гор. Менск) у апошні час мела месца некалькі няшчасных выпадкаў і калецтва рабочых. Гэта з'яўляецца рэзультатам таго, што пытаннем тэхнікі безапаснасці ні дырэкцыя, ні фабком не займаюцца.

У варачным аддзяленні рознічнага цэха на падлозе вялікія ямы, а між тым, тут рабочыя разносяць гарачую масу. У гэтым-жа цэху вентыляцыя не ў парадку, цэх налоўнен заўсёды парам. Або ўзяць такую з першага погляду дробязь, як заспергальнік у ірысным станку. Адсутнасць яго наносіць вялікую шкоду для рабочых.

Нядобра таксама у нас па пытанню а вы працы жанчыны. Цяжарная работні тав. Дыяновіч увесь час працуе на н ной змене, што законам катэгарычна баронена.

На фабрыцы фармальна існуюць г мадскія інспектары. У іх задачу ўва дзіць сурова сачыць, як выконваюцца рэкцыяй законы па ахове працы. Ад гэтымі інспектарамі фабком не кіруе. яны абмежаваны такімі правамі, што гуць заходзіць у цэх толькі тады, в працуюць самі.

БЕРЗІН.

Гніе будынак школы

У 1929 годзе ў м. Ельску пабудован двухпавярховы будынак школы, у якой навучаецца 870 дзяцей. Але гэта школа пабудавана па яўна шкодніцкім праекту. Парапеты без адтулін і адліваў, у выніку чаго затрымліваецца маса атмасферных ападкаў, ад чаго сырэюць сцены. З-за гэтага на працягу сямі год будынак стаў непрыгодным. Зараз у пакоі, дзе змяшчаецца 4 класы, абвалілася столь, а ў астатніх утварыліся шчыліны. У сувязі з такім становішчам дырэкцыя школы склала каштарыс на пэракрыцце даха. Ельскі райвыканком у студзені ўзняў хадайніцтва аб водпуску сродкаў на рамонт г школы перад Мазырскім акрвыканко Наркамасветы і Соўнаркомам. Акрвы ком таксама хадайніцтва падтрымаў.

Аднак, зараз чамусьці Наркомас зноў пераслаў на разгляд справу ў р выканком, у той час, калі апошні са стойна гэтае пытанне не можа вырашы без згоды цэнтральных арганізацый.

І так справа бясконца цягнецца. А кі каштоўны будынак, на які затрач многа грошай, прыходзіць у негодн

БЕКАРЭВІЧ, МУЗАРКЕВІЧ ЮДНОВІЧ.

НАША РАДЗІМА

МУРМАН УЧОРА І СЕННЯ

Аб Кольскім паўвостраве летапіс гаворыць як аб «дзікай Лопі», Карамзін называў яго «гробам прыроды».

Лапары пасвілі аленяў і плацілі даніну футрай і рыбай то нарвежцам і шведам, то рускім. Пётр Першы, пабудаваўшы ля Фінскага заліва сталіцу, стварае ля Кольскага заліва крэпасць. Пецербург бярэцца за «асваенне Поўначы». Царскія гарматы адліваюцца з аланецкага чыгуну, з аланецката мармура будуюцца палацы. Але на гэтым справа заканчваецца.

Паўночныя домны хутка пагаслі, рудні кі затоплены. Чыгун і вугаль ідзе з Англіі, граніт — з Амерыкі, кварц — з Фінляндыі, фосфарыты — з Марока. Калісь, у часы Ламаносава, Мурман не толькі завальваў траской і селядцамі рускі рынак, але вывозіў рыбу і ў Францыю, Італію, Іспанію і Нарвегію. Але хутка справа дайшла да таго, што нарвежцы пачалі прывозіць у Расію селядцы паўночных вод. У апошнія гады перад вайной колькасць рыбакоў на Мурманскім узбярэжжы знізілася настолькі, што насельніцтва паморскіх пасёлкаў вылічалася дзесяткамі чалавек.

Сусветная вайна адрэзала для Расіі водныя шляхі ў Еўропу. У Балтыцкім моры гаспадарылі германскія падводныя лодкі. Пасля ўступлення ў вайну Турцыі такое-ж становішча стварылася ў Чорным моры. Адзін Архангельск, порт ля Белага мора, справіцца з патокам грузаў, вядома, не мог, будучы звязаны з Масквой вузкакалейнай чыгункай, апрача таго, гэта порт, які замярзае на 6—7 месяцаў на працягу года.

У першыя дні вайны 1914 года ў кіруючых сферах царскай Расіі вярнуліся да старога, шмат раз і заўсёды безрэзультатна высоўваўшагася праекта аб пабудове чыгункі на Мурман, да незамярзаючых вод. Праект быў паспешна абмяркован і прынят, і ранняй вясной 1915 года на Мурмане прыступілі ўжо да работ. Палоннікі— немцы, мадяры, чэхі, балгары і кітайцы-кулі—правялі праз лясы, балоты, скалы самую паўночную і самую дрэнную чыгунку ў свеце. Тут не было ні людзей, ні жылля, ні харчоў, ні простых грунтавых дарог. Дарога будавалася вельмі дрэнна, але неўзабаве, у канцы 1916 года яна была гатова і здана, хаця прапускная здольнасць яе была нікчэмнай, і ўзнікшы новы порт Мурманск астаўся недаабсталяваным.

Большэвікі зусім змянілі твар Кольскага поўвострава. У Хібінскай тундры, за палярным кругам знойдзены каштоўныя выкапні. Парода, знойдзеная ў Хібінскіх горах, складаецца з двух асноўных элементаў: па-першае — апатыт, з велізарным процантам фасфарыта і, па-другое — нефелін, з такім-жа велізарным утрыманнем шчолачаў. Прамысловая вартасць абодвух парод надзвычай вялікая, асабліва калі прыняць пад увагу размеры залежаў, плошча якіх вызначаецца дзесяткамі тысяч квадратных метраў, і велізарныя запасы, якія перавышаюць 500 мільёнаў тон. Апатыта-нефелінавыя руды— гэта ўгнаенне і алюміній, сода і поташ, цэмент, фосфар для запалак, нефелінавыя кіслоты — для вырабу шкла, моцнай скуры, вогнетрывалага дома, экстракты для негніючых шпал і непрамакальнай тканіны. Апатытавыя жылы Нарвегіі даюць каля 1.000 тон у год, і яны лічацца буйнейшымі ў Еўропе, а СССР, бярэчы ў Хібінах па 2,5 млн. тон за год, вычарпае іх запасы толькі праз... 200 год. Апатыты— салідная крыніца валютных каштоўнасцей краіны. Першая партыя апатытавай руды была вывезена ў Германію ў 1930 годзе. З таго часу дынаміка экспарта вельмі хутка расла: у 1930 годзе—5 тыс. тон, у 1931 г. — 20 тысяч тон, у 1932 г. — 100 тыс. тон, у 1933 г. — 294 тыс. тон і т. д.

Экскаватары сталёвымі чэлюсцямі ўгрызаюцца ў голыя схілы Хібін — у гэту дзіўную скарбніцу. Адсюль нагружаныя паязды вязуць гэту руду на пэрапрацоўку і на экспарт. Недалёка адсюль вырас горад. Горад, які быў закладзен Сергеем Міронавічам Кіравым і атрымаў яго імя, расце надзвычай хутка. У студзені 1930 года — 200 жыхароў, праз год — 17 тысяч, яшчэ праз год — 32 тысячы, а сёння больш 50 тысяч налічвае горад Кіраўск. Сонца не паказваецца тут з паловы лістапада і ўвесь снежань. Затое з красавіка — белыя ночы, а летам на працягу паўтара месяца — няспыны дзень, сонца не выходзіць з гарызонта. Цёплае цячэнне Гальфштрома адчуваецца і тут, у глыбіні поўвострава. Сярэдняя гадавая тэмпература — мінус адзін, такая-ж, як і на Урале. Сярэдняя студзеньская — мінус трынаццаць, такая-ж, як у Іванаве.

Шпарка расце і другі новы горад — Манчагорск. Некалькі год назад тут знойдзены нікелевыя руды. Нікель патрэбен нашай прамысловасці, нашай арміі.

У царскай Расіі свайго нікеля не здабывалі, яго куплялі ў Канадзе, дзе сканцэнтраваны сусветныя запасы нікеля. Совецкія геолагі знайшлі нікель у Орску (на Урале) і ў Мончытундры.

Будаўніцтва ў Мончы — грандыёзная новабудоўля другой пяцігодкі. Да 1938 года ў будаўніцтва Манчагорска будзе ўкладзена звыш 600 млн. рублёў — амаль столькі-ж, колькі ў Магнітагорску, які некалькі год будавала ўся краіна. Тут вырасце социялістычны горад са стадыёнам, паркам культуры, асфальтаванымі вуліцамі — запалярны горад нікеля.

Змяніў свой твар незамярзаючы порт Мурманск. Яшчэ якіх-небудзь 20 год назад на месцы, дзе раскінуўся зараз горад з сотнямі новых дамоў, шырокіх вуліц і пляцоў, тулілася толькі некалькі ўбогіх хат старадаўняга Сямёнаўскага пасёлка. Горад быў заснован у верасні 1916 года. У 1920 годзе, пасля адыходу англічан, ён налічваў 2 тыс. жыхароў. Пасля сканчэння грамадзянскай вайны пачаўся хуткі рост Мурманска, у развіцці якога ярка адлюстроўваецца ўвесь бурны працэс социялістычнага будаўніцтва ў краіне.

У 1929 годзе ЦК ВКП(б), а па яго даручэнню Сергей Міронавіч Кіраў, шчыльна заняўся праблемай Поўначы. У гэтым-жа годзе тав. Кіраў зрабіў паездку па Кольскаму поўвостраву, тундры якога нават мясцовым насельніцтвам лічыліся непраходнымі. Гэта дата з'яўляецца пераломнаю для далейшага развіцця Кольскага поўвострава. Мурманск у 1929 годзе налічваў 11,5 тыс. насельніцтва, а ў 1935 годзе ўжо 100 тысяч.

Нядаўна горад узбагаціўся буйнай Туломскай гідрастанцыяй. (Рака Тулома цячэ ў шыротным напрамку, недалёка ад узбярэжжа Кольскага поўвострава). Будаўніцтва яе праводзілася ў тэрміны, незвычайныя для гідрастанцыі. Пачата была яна ў канцы 1933 года, а яе гідратэхнічныя пабудовы былі прыняты ўрадавай камісіяй у верасні 1936 года.

Эканоміка Мурмана — гарманічнае спалучэнне дружнай работы на сухазем'і і на моры. Сотні суднаў-рыбаловаў, пабудаваных на совецкіх верфях, з дня на дзень вычэрпваюць тысячы тон траскі, камбалы, селядцоў. Судны-зверабоі выкідваюць на бераг тушы цюленяў, маржа, белугі, перпы. Заводы робяць кансервы, філе, ікру, клей, медыцынскі тлушч. Бясконцым патокам ідзе сюды экспартны лес з Карэліі, экспартная руда з апатытавых распрацовак. І гэты незамярзаючы порт, зімовая «фортка» для ленінградскага «акна ў Еўропу» ператвараецца ў бурна растучы цэнтр багацейшага Кольскага поўвострава.

А поўвостраў мае бязліч багаццяў. У 1932 годзе на Ленінградскай партыйнай канферэнцыі тав. С. М. Кіраў настойліва заклікаў да асваення тундраў.

«Я думаю, — сказаў ён, — што ўсе нашы асветныя арганізацыі, пачынаючы з Акадэміі Навук, і ўсе практычныя работнікі павінны ўзяць прыклад з Ламаносава і сапраўды вачыма і рукамі абмацаць усё, што ёсць у гэтым багатым і абшырным краі». Атрады, кіруемыя буйнейшымі Совецкімі вучонымі, пранікліі ў тундру, дзе знайшлі рознастайныя мінералы і металы. «Уся Менделеевская сістэма элементаў прадстаўлена там», — сказаў тав. Жданаў на У. Ленінградскім З'ездзе Советаў.

І там, дзе нядаўна яшчэ была палярная пустыня, дзе тулілася некалькі дзесяткаў лапарскіх сем'яў, — там большэвікі пад кіраўніцтвам вялікага генія нашай эпохі таварыша Сталіна стварылі новыя социялістычныя цэнтры, новыя віды індустрыі, абузілі да жыцця раней па-мярцвяцку спаўшы край.

Б. ЛІБЕРМАН.

ПА СЛЯДАХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ «ЗВЯЗДЫ».

„ТАМ, ДЗЕ СТРАЧАНА ПАЛІТЫЧНАЕ ЧУЦЦЁ"

Пад такім загалоўкам «Звязда» змясціла 14 лютага 1937 г. артыкул аб становішчы аршанскага мясакамбіната. Утворанай Наркамхарчпромам СССР і Галоўмясам праверкай устаноўлена, што на мясакамбінаце меў месца шкодніцкі акт, які заключаўся ў далучэнні каналізацыйнай трубы з водаправоднай магістраллю. Гэты шкодніцкі акт не быў выяўлен кіраўніцтвам камбіната толькі ў рэзультаце прытуплення большэвіцкай пільнасці, заціску крытыкі і самакрытыкі. Праверкай таксама ўстаноўлены факты безгаспадарчасці ў рабоце мясакамбіната, якое выразілася ў вялікіх стратах жывой вагі, падзяжку жывёлы, псаванні прадуктаў, зрыве работы па асваенню новых норм выпрацоўкі, безгаспадарчым выдаткаванні дырэктарскага фонда, значн перавыдатках заработнай платы, ц вых і агульнакамбінацкіх выдаткаў і здавальняючай мабілізацыі абарот сродкаў.

Загадам па Народнаму камісары харчовай прамысловасці СССР ад 16 савіка тав. Мікаян зняў з работы дыр тара камбіната Васільева, абвясціўшы суровую вымову.

Загадам па камбінату зняты тэхні дырэктар камбіната Бертані, начал аддзела будаўніцтва Міласлаўскі, чальнік фінансавага аддзела Аронаў.

Пры праверцы не пацвердзіліся вы нутыя абвінавачванні супроць інспект дзяржмясаінспекцыі тав. Мяшкова. сама не пацвердзіліся даныя аб т што Аронаў у мінулым буйны ганліва

АБМЕРКАВАННЕ ПЫТАННЯЎ ТРЭЦЯГА ПЯЦІГАДОВАГА ПЛАНА

ЭНЕРГЕТЫКА І ПАЛІВАСНАБЖЭННЕ

ытанні развіцця энергетыкі ў БССР і анні паліваснабжэння ў частцы расцёўкі тарфяных масіваў і размеркаванх паміж спажыўцамі атрымлівалі на цягу другой пяцігодкі няправільнае вы-ане ў Дзяржплане БССР.

Па пытанню развіцця энергетыкі быў дзяляцкі ўхіл у бок будаўніцтва ных нерэнтабельных мясцовых электранцый (Слуцк, Мозыр, Рэчыца, ушская папяровая фабрыка і т. д.). Гэтыя станцыі-карлікі, паглынуўмасу сродкаў, не могуць ні задавольнарастаючую патрэбу ў электраэнерраённых цэнтрах, ні садзейнічаць трыфікацыі сельскай гаспадаркі на ве-рыі.

ытанні будаўніцтва буйных раённых грэстанцый, вырашаючых комплексна задачы энергаснабжэння, электрыфікаі цеплафікацыі рэспублікі — тармазі-апаратам Дзяржплана БССР.

якасці канкрэтнага прыкладу можна ць на пытанне энергетыкі Гомеля.

охаборніцкае штогоднае расшырэнне чай электрастанцыі, якое робіцца на ту ўсёй другой пяцігодкі, разлічана ы раз на мінімальнае задавальненне наспеўшай патрэбы без уліку перыўнага росту ўсіх наяўных спажыў-без уліку неабходнага рэзерва для лячэння новых спажыўцоў.

новішча сеткі яшчэ больш пагаршае паснабжэнне Гомеля: будучы пабудавана ў 1923 г. пры магутнасці станцыі ў квт., сетка асталася да гэтага часу нная і зусім няздольна прапускаць ную ў 50 разоў магутнасць станцыі. ць значныя страты ў сетцы і падзенпружання ў спажыўцоў. Рэканструксеткі, зацверджаная па плану яшчэ ў годзе, тармозіцца няводпускам сродзанне тав. Куйбышэва на XVII ездзе аб вызначаным будаўніцтве ў буйнай раённай электрастанцыі планам БССР не рэалізавана.

праектаванне будаўніцтва «Вялікага г» затрачана каля мільёна рублёў. не некалькі разоў абмяркоўвалася ў БССР. Аднак, практычнае вырашэнага пытання затрымалася ў нетрах лярый Дзяржплана БССР. Праекты лі прадстаўлены на зацвярджэнне ага Соўнаркома і Саюзнага Дзяржіж тым, дэфіцыт у электраэнергіі востра адчуваецца ў Гомелі ўжо во-бягучага года.

канца 1938 года дэфіцыт магутнасці лі будзе вышэй 4000 квт.

пазбегнуць масавага адключэння ўцоў, неабходна неадкладна-ж прыда расшырэння існуючай ЦЭС на квт. з тым, каб новая магутнасць та ў эксплаатацыю ўжо ў 1938 го-эта мерапрыемства неабходна, хоць непажадальна як з прычыны недастасці тэрыторыі ЦЭС, так і па разню станцыі. Гэта пытанне мела 8 рашэнняў СНК БССР, але пракз зруху да гэтага часу няма.

часова неабходна неадкладна-ж чна вырашыць і прыступіць да жэння праекта «Вялікага Гомеля» каб першая чарга яго ў 12000 вайшла ў эксплаатацыю не пазней года.

спажывання электраэнергіі ў трэцягодны пойдзе за кошт развіцця ай прамысловасці, будаўніцтва но-йных прадпрыемстваў, шырокай фікацыі бліжэйшых раёнаў, расія абанентнай сеткі ў горадзе (да часу ўскраіны не асветлены), расія абслугоўвання быту, росту кольмунальных прадпрыемстваў (трамналізацыя) і т. д.

Вылічваючы штогодні рост выпрацоўкі электраэнергіі па працягу трэцяй пяцігодкі ў 18 проц., атрымаем наступную дынаміку выпрацоўкі:

1938 г.	— 67000	тыс. квт. гадзін.
1939 г.	— 79000	» »
1940 г.	— 93000	» »
1941 г.	—110000	» »
1942 г.	—130000	» »

Агульны рост выпрацоўкі за пяць год трэцяй пяцігодкі 128 проц. супроць 170 проц. у другой пяцігодцы.

Для такой выпрацоўкі патрабуецца да канца трэцяй пяцігодкі магутнасць у 27000 квт. З улікам замены магутнасці працуючых дробных станцый дрэўкамбіната, завода імя Ланцуцкага, добрушскай фабрыкі, маленькіх раённых станцый (Ветка і інш.) патрабуецца магутнасць у 36000 квт.

«Вялікі Гомель» павінен быць запраектаван на 48000 квт. з тым, каб першая чарга ў 12000 увайшла ў эксплаатацыю ў 1940 г., другая чарга ў 24.000 — у 1942 г. і трэцяя чарга — у 1944 г. Існуючая Цэнтральная электрычная станцыя павінна працаваць да заканчэння другой чаргі.

Неабходна таксама ў 3-й пяцігодцы поўнасцю знішчыць адрыў у праектаванні будаўніцтва ад пытанняў энергетыкі, які меўся на працягу 2-й пяцігодкі.

II. У пытанні паліваснабжэння не было цвёрдага плана торфаздабычы і размеркавання торфу.

Планы прымацавання пастаўшчыкоў да спажыўцоў мяняліся некалькі раз на працягу года (план па ЦЭС у 1936 г. мяняўся тры разы).

К аднаму спажыўцу прымацоўвалася па некалькі пастаўшчыкоў (ЦЭС у 1936 г. атрымала 4-х пастаўшчыкоў).

У адносінах торфаздабычы ўзят быў курс на развіццё дробных арцельных торфараспрацовак незалежна ад іх аддалёнасці ад чыгункі і рэнтабельнасці пастаўкі торфу гужам. Прычым заахвочваліся прыёмка і здача торфу на балотах, што прыводзіла да вялікага падаражання кошту перавозак: спажывец часта для нязначнай колькасці торфу вымушан быў трымаць апарат па яго ахове і транспартыроўцы з балота. Нярэдка (у Церахоўцы, напрыклад) у адным раёне і на адной чыгуначнай станцыі аказвалася некалькі спажыўцоў, што прывяло да ажыятажу ў аплаце за вывазкі і пагрузку торфу.

У выніку рэзаны торф арцеляў, нізкі па якасці, які псуецца ад далёкіх перавозак і шматразовага пераладачвання, абыходзіўся спажыўцу на 50 проц. даражэй чым лепшы машынафармовачны торф.

Спажыўцам аказвалася больш рэнтабельным пакінуць аплочаны торф на балотах, чым выкарыстаць яго як паліва.

Неабходна ў плане 3-й пяцігодкі шырока паставіць праблему торфаздабычы і торфазабеспячэння:

1. Паставіць распрацоўку вялікіх масіваў з арганізацыяй пастаўкі да чыгуначных станцый сродкамі пастаўшчыкоў. Дробныя арцельныя торфараспрацоўкі пакінуць выключна для забеспячэння пасёлкавага і ўнутрыраённага ўжывання.

2. Прымацаваць к аднаму спажыўцу не больш 2-х пастаўшчыкоў.

3. Прымацаванне правесці такім чынам, каб пазбегнуць сустрэчных перавозак, з улікам адпаведнасці якасці торфу патрэбам спажыўца.

4. Прымацаванне праводзіць на доўгі перыяд з тым, каб даць магчымасць правесці эфектыўныя мерапрыемствы па механізацыі вывазкі з балот (пабудова вузкакалейных шляхоў, рамонт дарог і т. д.).

Дырэктар гомельскай электрастанцыі МЯДЗВЕДЗЕЎ.

СТВАРЫЦЬ СЫРАВІННУЮ БАЗУ ДЛЯ ПАПЯРОВАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

Скарыстанне драўніны топаля для вытворчасці цэлюлозы і драўнінай масы пачалося каля трыццаці год назад (прыкладна, у 1905 годзе) у Італіі.

У СССР топаль (чорны топаль, або ясакар) сустракаецца ў значных колькасцях у поймах рэк сярэдняй і ніжняй часткі Саюза, дзе ён стварае чысты дрэвастой. У невялікіх колькасцях ён сустракаецца на поўначы і ў нас, у БССР. Даследваннi, праведзеныя ў раёнах Ніжняй Волгі, паказалі, што топаль тасямае лепшай прадукцыі на лёгкіх, пясчаных, з сумессю ілістых частак, вільготных алювіяльных глебах, заліваемых полай вадой, аднаўленне топаля ідзе насенным і вегетацыйным шляхам, прычым у апошнім выпадку размнажэнне адбываецца і парасткамі ад пня і пры дапамозе карнёвых адпрыскаў.

Што датычыць прадукцыйнасці топалевых насаджэнняў, то запас драўніны к 25—30 гадам на 1 гектар у ніжневолжскіх раёнах складае 270—400 кубаметраў пры вышыні ствала ў 25—27 метраў і дыяметры ў 21—27 сантыметраў. Ствараемая топалем маса драўніны ў 25—30 год роўна масе сасны ў 100—120 год.

Гадавы прырост шчыльнай топалевай ствоплавай масы на гектар, у поўным насаджэнні і пры 25-гадовым узросце спеласці, складае каля 14 кубаметраў, г. зп. у два разы больш, чым атрымліваецца ад яловых насаджэнняў, пры 60-гадовым абароце рубкі.

Устаноўлена, што белы топаль, які расце ў Горкаўскай вобласці, можа служыць для вытворчасці цэлюлозы і дрэўмасы ўжо ва ўзросце 10—15 год.

З усіх наяўных 18 розных відаў топаля ў Італіі перавага аддаецца канадскаму, хаця ўжываюць і іншыя віды. Указаныя пароды добра растуць на ўсякай глебе, калі яна толькі рыхлая і недалёка знаходзіцца працякаючая вада.

Для атрымання балансавай драўніны па арганізацыі вытворчасці цэлюлозы і драўнінай масы патрабуецца на рост дрэва канадскага топаля 10—12 год, а для чорнага топаля — 12—15 год. Рост і выспяванне баланса з хвойнай драўніны прадаўжаецца 30—40 год. Атрыманне добраякаснай цэлюлозы з топалевай драўніны праходзіць без асаблівых затрудненняў як па патроннаму, так і па сульфітнаму спосабу.

У Беларусі асноўнай драўніннай сыравінай для папяровай прамысловасці з'яўляецца, галоўным чынам, яловы баланс, (у 1936 годзе скарысталі 68.472 кубаметры), і на яліне дагэтуль асноўваліся ўсе дрэвамасныя вытворчасці фабрык, выробляючых картон і абвёртачную паперу.

Спецыяльныя вышукванні, праведзеныя за апошнія часы ў галіне лясных рэсурсаў у сувязі з намячаемай пабудовай двух драўнінна-цэлюлозных заводаў у Бабруйску і Віцебску, выявілі, што рэзервы драўніны, якія могуць быць скарыстаны для папяровай прамысловасці, не дазваляюць разлічваць на шырокае развіццё ў нас гэтай вытворчасці.

Папяровая прамысловасць БССР да гэтага часу карыстаецца цэлюлозай, якая прывозіцца з-за межаў рэспублікі. Кардынальным пытаннем нашай папяровай прамысловасці на даным этапе яе развіцця з'яўляецца стварэнне поўфабрыкатнай вытворчасці, якая базуецца на ўласнай сыравіне.

БССР мае ўсе шансы для культывавання топаля, што ўзмоцніць сыравінную базу папяровай прамысловасці і прынясе вялікую паслугу нашай рэспубліцы.

Топалевыя насаджэнні заслугоўваюць сур'ёзнай увагі не толькі як праблема сыравіны для цэлюлозна-папяровай прамысловасці, але яны важны для нас тым, што павялічваюць значэнне ліставых парод у нашай лясной гаспадарцы.

М. РОБІНАЎ.

Былы рабочы-абутнік, а зараз загадчык вытворчасці менскай арцелі «Чырвоны абутнік» тав. Левін З. А., які пераканструяваў гідраўлічны прэс для прыклейвання падэшвы. Тры такіх прэсы замяняюць 10 ранейшых прэсаў. Рацыяналізатарская прапанова дае 18 тыс. рублёў эканоміі ў год. НА ЗДЫМКУ: тав. Левін З. А. ля пераканструяванага прэса.

Фото Райхліна (БСФ).

КІРУЮЦЬ УСЁ ЯШЧЭ ЦЫРКУЛЯРАМІ

Рашэнні VI пленума ВЦСПС не ўнеслі колькі-небудзь заметнае ажыўленне ў работу Бабруйскага райкома саюза рабочых лесу і сплаву. Як і раней, скрыпяць тут пер'і, як і раней, у нізавыя прафарганізацыі цячэ паток цыркуляраў.

Не ведае маса членаў саюза пра работу свайго райкома. Работнікі райкома звыкліся не лічыцца з думкаю членаў саюза, парушаюць прафсаюзную дэмакратыю. Гэта з усёй відавочнасцю пажазвае ўся практыка работы райкома.

25 жніўня 1936 года на адным з пасяджэнняў прэзідыума быў кааптаван новы склад рэвізійнай камісіі. Кааптаван таксама пяперашні старшыня райкома саюза тав. Яскевіч.

Пагардліва адносяцца ў райкоме саюза да радавых членаў пленума. Член пленума тав. Рудзько працуе лесарубам на адным з участкаў, але ў райкоме гэтага нават не ведаюць і да работы не прыцягваюць.

Па вестках райкома саюза, на аб'яднаных ім вытворчасцях працуе 2788 чалавек, але членамі саюза з'яўляюцца толькі 1.989 чалавек. 800 чалавек аказаліся неўцягнутымі ў саюз.

Райком саюза зусім закінуў адну з важнейшых галін прафсаюзнай работы — барацьбу з траўматызмам. І не дзіўна, што па вытворчасцях гэтага саюза ёсць значная колькасць цяжкіх выпадкаў і павелічэнне водпускаў па хваробе. За 1936 год меркавалася затраціць на аплату водпускаў па часовай непрацаздольнасці 65.790 руб., а выдаткавана значна больш. Значны перавыдатак ёсць і ў першым квартале 1937 года.

Здавалася-б, час ужо давесці да ведама прафсаюзнай масы аб гістарычных рашэннях VI пленума ВЦСПС. Але ў райкоме саюза трымаюцца іншай думкі. Яго кіраўнікі быццам вады ў рот набралі, маўчаць. Яскевіч толькі збіраецца гэтымі днямі пазваніць рабачкомам наконт «прапрацоўкі» рашэнняў пленума. Аб выездзе на месца, каб растлумачыць масе рабочых значэнне пленума ВЦСПС, каб расказаць, як райком саюза мяркуе перабудаваць сваю работу, Яскевіч нават і не думае.

А. КАЦ.

ПА-РАНЕЙШАМУ ЗАЦІШША

Вывучэнне матэрыялаў VI пленума ВЦСПС, штодзённая работа з масамі павінна легчы ў аснову падрыхтоўкі да выбараў прафсаюзных арганізацый.

Нажаль, заўком вагонабудаўнічага завода імя Мяснікова вузка зразумеў сваю задачу і звёў усю работу да кароткай інфармацыі аб пленуме ў часе абедзенных перапынкаў. Старшыня заўкома Сабалеўскі не паклапаціўся вылучыць членаў заўкома ка кіраўніцтва вывучэннем матэрыялаў пленума ВЦСПС. Члены заўкома нават не прысутнічалі па цэхавых сходах і гаму вывучэнне матэрыялаў прайшло павярхоўна. Вось, напрыклад, рабочы-стаханавец механічнага цэха Варэнік не ведае: што такое тайнае галасаванне і як наогул будуць праходзіць выбары профорганаў.

Заводскі камітэт адарваўся ад рабочых, не ведае іх запатрабаванняў.

Лепшы стаханавец аўтагеншчык Толін Васіль працуе на заводзе больш трох год і нівочнага разу не быў у доме адпачынку. Заўсёды яму абяцаюць даць путёўку, але на абяцанні ўсё канчаецца. Неаднаразова рабочыя гаварылі аб прывядзенні ў санітарнае становішча канюшні, якая знаходзіцца побач з заводскім садам, але рэальных вынікаў няма і да сёнешняга дня.

Сабалеўскі ўжо каля трох год не адчытваўся перад членамі сваёй арганізацыі.

Культурна-масавая работа на заводзе з'яўляецца самым адстаючым участкам прафсаюзнай работы. За ўвесь год праведзена некалькі лекцый па вывучэнню Канстытуцыі і далей справа не пайшла. Антырэлігійная прапаганда зусім выпала з пад увагі заўкома. У інтэрнатах знаходзіцца 135 маладых рабочых, з імі нізкай работы не праводзіцца. Няма газет, шашак, а ўвечары пакоі асвятляюцца невялікімі газавымі лямпамі. Члены заўкома добра ведаюць, што ў інтэрнатах нехапае матрацаў, поўная антысанітарыя, але нічога не прымаюць, каб палепшыць бытавыя ўмовы.

Сабалеўскі парушае прафсаюзную дэмакратыю. Ён самастойна назначыў на пасаду старшыні камсода свайго былога тэхнічнага сакратара. Аб назначэнні ніхто не ведаў, нават члены заўкома.

Заўком у чаканні інструктажа з ЦК саюза яшчэ не арганізаваў вывучэнне матэрыялаў пленума, не гледзячы на тое, што прафсаюзныя арганізацыі стаяць напярэдадні выбараў.

П. ЛЕВАНОВІЧ.

АБ РЭЧЫЦКІХ УРАЧАХ І ЧУЛАСЦІ ЗАЎКОМА

У сярэдзіне 1936 года я паступіла працаваць сакратаром заўкома дубільна-экстрактнага завода імя Варашылава (г. Рэчыца). У студзені г. г. я павінна была пайсці ў дэкрэтыўны адпачынак. Каб лепш пераканацца аб часе родаў, я 13 студзеня рашыла пайсці да ўрача Гарадской амбулаторыі Гурэвіч.

— Да родаў у вас яшчэ асталося 4 месяцы, — паведаміла яна.

Праходзілі тыдні, я працавала. Але раптам у сакавіку стала сябе адчуваць дрэнна. І неўзабаве падала заяву ў заўком і настойліва патрабавала адпусціць у дэкрэтыўны адпачынак. Будучы ў адпачынку, амаль 5 дзён знаёміла работніка, які прымаў у мяне справы. 16 сакавіка я ледзь дайшла з завода (адлегласць 7 кілометраў) у раённую больніцу і нарадзіла сына.

— Чаму вы мала былі ў дэкрэтыўным адпачынку? — запытала мяне ўрач Полева.

Я гавару: — пралічыўся ўрач Гурэвіч. Тады яна зразумела у чым справа. Каб скрыць сляды злачынства свайго знаёмага ўрача, Полева ідзе на ўсякія махінацыі. Яна піша фальшывую даведку для рэгістрацыі у ЗАГС'е, што быццам дзіцё неданошана. Прычым, у бюлетэні (забылася) напісала, што роды — 9-месячныя, нармальныя. Устае пытанне: хто даў права рэчыцкім урачам груба парушаць совецкія законы, якія ахоўваюць правы маперы. У заўкоме (старшыня Рэзэр) да мяне адносіліся бяздушна. Зарплату па бюлетэню доўгі час чамусьці затрымлівалі. І толькі тады, калі мой муж пазваніў пракурору, заўкомаўцы выплацілі па 150 рублёў у месяц замест стаўкі 200 рублёў.

Пра мае мытарствы добра ведаюць сакратар парткома гэтага завода т. Голуб, старшыня райпрофсовета Эльперын, пракурор раёна Краснаслабодцаў і загадчык раённага аддзела аховы здароўя Ліпін, але яны да гэтага аднесліся роўнадушна. Ліпін нават заявіў: «Дзіцё жыва, то і кармі на здароўе».

М. С. ХРАШЧАНКА.

Сакратар заўкома рэчыцкага завода імя Варашылава.

НЕКАТОРЫЯ ПЫТАННІ МЕХАНІЗАЦЫІ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ БССР

аргэйшыя поспехі дасягнуты намі ізацыі социялістычнай сельскай кі ў перыяд першай і другой пя-У соўгасах і калгасах БССР, як м Совецкім Саюзе, мы маем высоант механізацыі асноўных працэьскагаспадарчай вытворчасці, гачынам механізацыі паляводчых .

лях Совецкай Беларусі працуюць ы трактароў совецкай вытворчасці: ыя і паўночныя камбайны, трактглебаапрацоўваючыя і пасеўныя і машыны, ільноцерабілкі, бульныя машыны і т. д. Многія з аспадарчых машын, галоўным чыанізуючыя асобныя працэсы тах і гародніх культур, створаны і совецкай вытворчасцю ў перыяд пяцігодкі і з'яўляюцца навінкай й суветнай сельскагаспадарчай

оспехі па механізацыі сельскай кі нашай распублікі былі-б яшчэ , каб не шкодніцтва контррэвоіх троцкістаў, правых контррэнераў, нацдэмаў і іншых ворагаў Нацдэмаўскія, троцкісцкія і іножыя элементы, якія сядзелі ў ме БССР да апошняга часу, і сваю шкодніцкую работу ў меі сельскай гаспадаркі. Яны пера-завозу ў БССР камбайнаў, матрактараў і іншых складаных аспадарчых машын. Праводзілі ую работу па невыкарыстанню х ужо машын, арганізоўвалі паломкі трактараў. Гэта пацць, напрыклад, факты дрэннага ння радковых сеялак, усіх бульмашын. Бульбяныя машыны ў зе не былі скарыстаны ў нашай ы.

кі з Наркамзема прыклалі сваю адносінах механізатарскіх кадпадбіралі і насаджалі сваіх люправязлення шкодніцкай рабоаве рамонту і скарыстання тракўсіх сельскагаспадарчых машын. шым, як шкодніцтвам з боку ма можна вытлумачыць сістэзрывы падрыхтоўкі масавых механізацыі сельскай гаспадар-

кіраўніцтва Наркамзема БССР не лічылася з думкаю маладых совецкіх спецыялістаў, а наадварот—зацірала іх і выжывала. Рад навуковых закончаных работ, праведзеных Беларускай станцыяй механізацыі сельскагаспадарчых машын па механізацыі асобных працэсаў сельскай гаспадаркі ў другой пяцігодцы, было «зацёрта» кіраўніцтвам Наркамзема, а работнікі, праводзіўшыя гэту работу, былі намечаны Бенкам да вытнання. І толькі дзякуючы дапамозе з боку Сельскагаспадарчага аддзела ЦК ВКП(б) гэтыя работы атрымалі ўсесаюзнае прызнанне і пушчаны ў масавую вытворчасць.

Для таго, каб з поспехам праводзіць у трэцяй пяцігодцы механізацыю сельскай гаспадаркі, трэба перш за ўсё ліквідаваць вынікі шкодніцтва, выкарчаваць усіх ворагаў народу ў сельскай гаспадарцы. Трэба павысіць рэволюцыйную класавую пільнасць на ўсіх участках работы, ведучы бязлітасную барацьбу з усякага роду аварыямі, дрэнным рамонтам і скарыстаннем машын.

У адпаведнасці з планам механізацыі сельскай гаспадаркі неабходна распрацаваць план падрыхтоўкі праверэных механізатарскіх кадраў масавай кваліфікацыі і безумоўна яго выканаць. Трэба забяспечыць большэвіцкім кіраўніцтвам і выкладчыцкім персаналам усе механізатарскія школы, дабіўшыся забеспячэння завазімых у трэцяй пяцігодцы машын добра абучанымі кадрамі.

Дасягнутыя поспехі ў перыяд двух пяцігодак у стварэнні і росце совецкага сельскагаспадарчага машынабудаўніцтва, а таксама далейшае яго пашырэнне даюць магчымасць яшчэ хутчэйшага развіцця механізацыі сельскай гаспадаркі ў трэцяй пяцігодцы. Трактарны парк, як рашаючая сіла ў механізацыі сельскай гаспадаркі, у трэцяй пяцігодцы моцна ўзрасце за лік новых канструкцый трактараў.

Калі да гэтага яшчэ ўлічыць велізарнейшыя магчымасці далейшага росту выкарыстання і прадукцыйнасці машынатрактарнага парка (у трэцяй пяцігодцы, несумненна, выпрацоўка на трактар і прычэпныя машыны моцна ўзрасце), а таксама пашырэнне з года ў год вытворчасці прычэпных машын, то к канцу трэцяй пяцігодкі галоўныя сельскагаспадарчыя працэсы павінны быць механізаваны поўнасцю. І не толькі працэсы, але і ў цэлым апрацоўка галоўнейшых культур, на базе пашырэння існуючай і стварэння навейшай сельскагаспадарчай тэхнікі, павінна быць у асноўным механізавана поўнасцю к канцу трэцяй пяцігодкі.

Механізаванае ворыва ў трэцім пяцігодцы неабходна забяспечыць поўнасцю. Для гэтага патрэбна правільная арганізацыя поўнага выкарыстання трактараў як «ЧТЗ», так і «СТЗ—ХТЗ» з прымяненнем для «ЧТЗ» двух пяцікорпусных плугоў у сашчэпцы або ў сашчэпцы трох-чатырохкорпусных плугоў, а таксама і шыроказахватных плугоў (10—12-корпусных), якія знаходзяцца ў даны час у серыйнай вытворчасці і ў бліжэйшы час паступяць на масавую вытворчасць.

Забеспячэнне поўнасцю механізацыі пасеву зернавых культур павінна ісці, галоўным чынам, за лік павелічэння радковай сяўбы трактарнымі сеялкамі і ўнядрэння, у адпаведнасці з цягавымі ўласцівасцямі трактараў, шыроказахватных сеялак, пачынаючы з 24-радковых і вышэй, шырока прымяняючы агрэгатны спосаб сяўбы, выкарыстоўваючы для гэтага сашчэпкі.

Поўную механізацыю ўборкі зернавых культур неабходна павялічыць за лік штогодна павялічваючагася завозу ў БССР паўднёвых і паўночных камбайнаў і за лік больш поўнага іх выкарыстання, давёўшы да канца трэцяй пяцігодкі ўборку збожжавых культур толькі камбайнамі не менш, чым на 60 проц., выкарыстоўваючы іх у поўным спалучэнні з іншымі зернаўборачнымі машынамі.

У сувязі з гэтым выцякае задача спалучэння ва ўмовах БССР членараздзельнай уборкі (у два прыёмы) з уборкай у адзін прыём паўднёвымі камбайнамі. Павышаная вільготнасць збожжа, асабліва ў першыя дні ўборкі, не заўсёды ўстойлівае надвор'е ў момант уборкі — адцягвае час уборкі камбайнамі.

Для поўнага выкарыстання паўднёвых камбайнаў ад пачатку і да канца ўборкі неабходна паралельна з завозам паўднёвых камбайнаў завозіць віндроўэры (шыроказахватныя жняркі), якія ў сашчэпцы з трактарам робяць папярэдняе акошванне збажыны з наступнай падборкай прасохшага скошанага пасеву камбайнам, снабжоным спецыяльным падборшчыкам.

У плане трэцяй пяцігодкі, пачынаючы ўжо з 1938 года, неабходна прадугледзець завоз у БССР для кожнага паўднёвага камбайна камплект падборшчыка і адпаведную колькасць віндроўораў, хаця-б з разліку адзін віндроўэр на два паўднёвых камбайны.

Шырокае ўнядрэнне камбайнаў у БССР высоўвае ў трэцяй пяцігодцы паўсямесную арганізацыю ў соўгасах і калгасах сушкі зярна, пропуску зярна э-пад камбайнаў пад зернасушылкі. Таму выбар аднаго або некалькіх відаў сушылак і іх далейшыя ўдасканаленні павінны быць праведзены ўжо ў гэтым годзе.

Механізацыю малацьбы зернавых, убраных жняркамі і спопавязалкамі, у трэцяй пяцігодцы неабходна забяспечыць поўнасцю на базе існуючых канструкцый малатарань.

На вытворчасці стаіць шыроказахватная ільноцерабілка ВНИИЛ-5, якая і механізуе ўборку ільну. К канцу трэцяй пяцігодкі ўборка ільну павінна быць, таксама як і зернавыя культуры, поўнасцю механізаванай.

Працэс малацьбы ільну павінен таксама быць механізаван поўнасцю. Планам трэцяй пяцігодкі неабходна прадугледзець, побач з завозам складаных малатарань, разлічаных на механічную цягу, вытворчасць мясцовай прамысловасцю БССР прасцейшых высокапрадукцыйных ільномалатарань накшталт ільномалатарань Лук'янава.

Рассцілка ільну да гэтага часу робіцца ўручную. У апошні час створаны ў БССР эксперыментальныя параконныя ільнорасцілачныя машыны, унядрэнне якіх у калгасы трэба будзе праводзіць у трэцяй пяцігодцы.

Для первічнай апрацоўкі ільну існуючыя механізаваныя ільнотрапалкі Сяргеева і Антонава павінны астацца, як асноўныя машыны, і на трэцюю пяцігодку, маючы на ўвазе таксама скарыстанне да канца ўжо зробленых прасцейшых ільнотрапалак Санталава і Гарлачова.

Мы маем на масавай вытворчасці трактарныя двухрадныя бульбапасадачныя машыны, якія працуюць па двэ ў сашчэпку, трактарныя чатырохрадныя акучнікі і двухрадныя трактарныя бульбаўборачныя машыны. Вытворчасць і прымяненне гэтых машын у трэцяй пяцігодцы павінны моцна ўзрасці, дабіўшыся ў асноўным к канцу трэцяй пяцігодкі поўнай механізацыі культуры бульбы. З гэтай мэтай неабходна ў першыя два гады трэцяй пяцігодкі стварыць і асвоіць двухрадны бульбаўборачны камбайн і ў спалучэнні з існуючай бульбаўборачнай машынай максімальна скараціць патрэбную колькасць рабочых рук на падборку клубняў.

Механізацыя жывёлагадоўлі, не гледзячы на некаторае сваё развіццё ў другой пяцігодцы, яўна адстала ад росту механізацыі паляводчых працэсаў. Між тым, некаторыя працэсы ў гэтай галіне, асабліва ўнутрысядзібны транспарт, падрыхтоўка кармоў і іншае, не патрабуюць вялікіх капіталаўкладанняў і пры належнай арганізацыі зямельнымі органамі гэтай справы можна было механізаваць куды больш.

Першаступеннае значэнне набывае механізацыя ўборкі сена і іншых кармовых траў, вырашэнне якой павінна быць ажыццёўлена к канцу трэцяй пяцігодкі, бо гэты працэс адзін з працаёмкіх і звязан — таксама, як і ўборка зернавых, ільну, бульбы,—у выпадку перастою з вялікімі стратамі.

Для механізацыі ўнутрысядзібных працэсаў жывёлагадоўчых ферм у другой пяцігодцы створаны новыя кормазапарнікі, корнярэзкі, аўтапаілкі, падвесныя і наземныя прасцейшыя дарогі і ўсё гэта пушчана ў серыйную вытворчасць. У трэцяй пяцігодцы неабходна максімальна ўнядрыць гэтыя машыны ў сельскую гаспадарку. Прасцейшыя з іх рабіць па лініі мясцовай прамысловасці.

У справе механізацыі дробнаасушальнай сеткі па масавай меліярацыі тып канавакапальнікаў, якія ўжо ёсць, з далейшым іх удасканаленнем, у асноўным задаволіць запатрабаванні. Для асваення зямель і іх лепшага скарыстання, апрача таго, неабходна пашырыць вытворчасць і завоз у БССР карчавальных машын, кустарэзаў, купінарэзаў, хмызняковых і балотных плугоў.

Планіруючы завоз у БССР трактараў і сельскагаспадарчых машын на трэцюю пяцігодку, неабходна прадугледзець далейшы штогодны прырост норм выпрацоўкі трактарамі і прычэпнымі машынамі, забяспечваючы высокую якасць работ. Гэта магчыма на базе правільнай арганізацыі скарыстання машын, падбору і падрыхтоўкі механізатарскіх кадраў і прадпрыняцтва патрабаванняў павышэння якасці да выпускаемых заводамі машын.

Пры планіраванні завозу машын на трэцюю пяцігодку для механізацыі асобных культур неабходна ўлічваць комплекснасць машын, якія ў цэлым механізуюць культуру. Напрыклад, механізацыя ўборкі бульбы прадугледжвае механізацыю пасадкі і догляду, без чаго пільта правесці правільную механізаваную ўборку. Аднак у 1936 годзе ў БССР мэўся разрыў паміж механізаванай пасадкай і ўборкай. Бульбы машыннай пасадкі аказалася менш, чым неабходна было для ўборачных машын, адсюль і атрымаўся прастой уборачных машын. Такое-ж становішча атрымліваецца і ў гэтым годзе. Таму гэтая ўмова павінна быць прадугледжана планам трэцяй пяцігодкі па кожнаму году.

Шырокае ўнядрэнне сродкаў механізацыі ў сельскай гаспадарцы патрабуе арганізацыі пры менскім політэхнічным інстытуце факультэта па механізацыі сельскай гаспадаркі для падрыхтоўкі высокакваліфікаваных інжынераў-механізатараў, маючы на ўвазе, што машынатрактарныя станцыі ў трэцяй пяцігодцы, у сувязі з ростам насычэння МТС і соўгасаў машынамі, патрабуюць вялікай колькасці тэхнічных кадраў.

Яшчэ шырэй, чым да гэтага часу павінна разгарнуцца навукова-даследчая і вопытная работа ў галіне механізацыі сельскай гаспадаркі, накіраваная на хутчэйшае ўнядрэнне і асваенне сродкаў механізацыі ў сельскай гаспадарцы, распрацоўку новых машын і ўдасканаленне існуючых.

На базе беларускай станцыі механізацыі сельскай гаспадаркі, якая дала рад машын па масавую ўсесаюзную і мясцовую вытворчасць, трэба прадугледзець у плане трэцяй пяцігодкі арганізацыю ў 1938 годзе беларускага навукова-даследчага інстытута механізацыі сельскай гаспадаркі.

Асаблівае значэнне ў трэцяй пяцігодцы набывае развіццё электрыфікацыі сельскай гаспадаркі, што неабходна мець на ўвазе пры складанні плана механізацыі трэцяй пяцігодкі. Трэба прадугледзець асабліва прымяненне электрыфікацыі ў жывёлагадоўчых працэсах і на стацыянарных работах.

Моцна ўзрастае патрэба ў трэцяй пяцігодцы ў механічным транспарце. Аўтамабільныя заводы, павялічваючы з года ў год сваю вытворчасць, у значнай меры задавальняюць запатрабаванні сельскай гаспадаркі ў аўтамабілях. Аднак неабходна ў плане трэцяй пяцігодкі прадугледзець транспарт пры дапамозе трактарнай цягі, галоўным чынам, перыяды года, менш напружаныя ў сэнсе загружанасці трактарнага парка. Унутрысядзібны транспарт трэба ў значнай меры адвесці для коней.

МАЦЭПУРА.

Дырэктар Беларускай станцыі механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі.

АДКРЫУСЯ СОВЕЦКІ ПАВІЛЬЁН НА СУСВЕТНАЙ МІЖНАРОДНАЙ ВЫСТАВУЦЫ

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 25 мая. (БЕЛТА). Сёння ў 17 гадзін па парыжскаму часу ва ўрачыстай абстаноўцы адбылося адкрыццё павільёна СССР на сусветнай парыжскай выстаўцы. На адкрыцці прысутнічалі члены французскага ўрада, прадстаўнікі дыпламатычнага корпуса, шматлікія прадстаўнікі французскай грамадскасці, навукі, мастацтва і прамысловасці—усяго 2 тысячы чалавек.

Совецкі павільён быў адкрыт у дакладна ўстаноўлены тэрмін, адным з самых першых павільёнаў 44 дзяржаў, якія прымаюць удзел у выстаўцы. Совецкі павільён—адзін з самых буйных іншаземных павільёнаў.

У прамове, прысвечанай адкрыццю павільёна, генеральны камісар совецкага павільёна на міжнароднай выстаўцы тав. І. І. Межлаук заявіў: «Тое, што паказана на выстаўцы, прадстаўляе сабою рэзультат 20-гадовай нашай працы, кіруемай геніем Леніна і Сталіна, рэзультат нашых двух пяцігадовых планаў, ажыццёўленых раней устаноўленага тэрміну, рэзультат нашага прагрэсу, якога не могуць спыніць ніякія атакі замежных і ўнутраных ворагаў».

Пераходзячы да кароткага агляду совецкага павільёна, тав. Межлаук спыняецца на выстаўленых у першай зале матэрыялах, якія ілюструюць Сталінскую Канстытуцыю.

«Глыбока дэмакратычная,—заяўляе тав. Межлаук, — совецкая Канстытуцыя прадстаўляе сабой рэзультат заваяванняў, дасягнутых за 20 год рэвалюцыйнай барацьбы. Гэта асноўны закон краіны, якая пакончыла раз і назаўсёды з тымі бядотамі, якімі з'яўляюцца эканамічныя крызісы і беспрацоўе. Канстытуцыя краіны, якая забяспечвае на справе сваім грамадзянам правы на працу, на адпачынак і на асвету. Гэта асноўны закон краіны, якая аддала ў бясплатнае і пастаяннае карыстанне зямлю сялянам, якая вызваліла жанчын і забяспечвае сапраўдную роўнасць усім нацыянальнасцям Совецкага Саюза».

«Тут ажыццёўлена,—указвае ў заключэнне тав. Межлаук, — прыязнае супрацоўніцтва нашых двух краін. Гэта супрацоўніцтва мы хочам зрабіць пастаянным, пладатворным ва ўсіх галінах, на якіх пашыраецца чалавечы геній, на карысць вялікай справы міру, якога жадае чалавецтва!».

Затым выступілі з прамовамі генеральны камісар французскага ўрада па парыжскай міжнароднай выстаўцы 1937 года Лабе і паверанны ў справах СССР ва Францыі тав. Гіршфельд.

ПАРЫЖ, 26 мая. (БЕЛТА). Учора на адкрыцці совецкага павільёна на міжнароднай выстаўцы пасля тав. І. І. Межлаука выступіў з прамовай генеральны камісар міжнароднай выстаўкі Лаббе.

— 1937 год, — заявіў Лаббе, — з'яўляецца для Совецкага Саюза знамянальным годам, бо ў гэтым годзе спаўняецца 20-годдзе Кастрычніцкай рэволюцыі і першая гадавіна новай совецкай Канстытуцыі.

Міжнародная выстаўка ў Парыжы, — гаварыў далей Лаббе, — прадастаўляе Совецкаму Саюзу магчымасць паказаць народам усяго свету, што ў рэзультаце ажыццяўлення на працягу 20-гадовага перыяда прынцыпаў Совецкага Саюза створана з ранейшай адсталай краіны першакласная прамысловая і аграрная дзяржава, у якой праца пастаўлена па службу дабрабыту народу.

Далей Лаббе адзначыў, што на міжнароднай выстаўцы совецкі ўрад лічыў неабходным перш за ўсё паказаць, як «мастацтва і тэхніка служаць працоўным у краіне, дзе мастацтва акружана любоўю ўсіх слаёў насельніцтва».

НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

ПАЎНОЧНЫ ФРОНТ

У раёне Дзіма і Юрэ (на паўднёвы усход ад Більбао) прадаўжаюцца ўпартыя баі, якія даходзяць да рукапашных схватак. Рэспубліканскія войскі аказваюць мяцежнікам упартае супраціўленне. Авіяцыя інтэрвентаў штодзень бамбардыруе мірныя населішчы. У часе бамбардыроўкі Більбао толькі ў адным прыгарадзе Сестао забіта і ранена больш 100 жанчын і дзяцей.

Згодна паведамлення агенцтва Гавас з Більбао, авіяцыя мяцежнікаў бамбардыравала населішчы Сондыка, Міравальес, Арыорыята (на поўдзень ад Більбао). Ваенны карабль мяцежнікаў «Альмірантэ Сервера» абстрэльваў узбярэжжа.

У сектары Леон (астурыйскі фронт) мяцежнікі пры падтрымцы германскай авіяцыі перайшлі ў наступленне. Рэспубліканскія часці прымусілі іх уцякаць.

ПАЎДНЁВЫ ФРОНТ

Як паведамляе агенцтва Гавас, у ноч на 25 мая некалькі самалётаў праціўніка бамбардыравалі Альмерыю (порт на поўдні Іспаніі). Адна бомба папала ў гандлёвы англійскі параход. Корпус судна быў пашкоджан і яно-б затанула, калі-б неадкладна не былі пушчаны ў ход магутныя помпы.

МАДРЫДСКІ ФРОНТ

Ва Ўніверсітэцкім гарадку рэспубліканская артылерыя моцным агнём абстрэляла клінічны шпіталь і прытулак Санта-Крыстына. Бамбардыроўка нанесла мяцежнікам вялікія страты.

У сектары Самосіеры мяцежнікі прадпрынялі атаку на рэспубліканскія пазіцыі. Яны былі падпушчаны на блізкую адлегласць, але, сустрэтыя ўрганным агнём кулямётаў і мартыр, адступілі, панёсшы вялікія страты.

26 салдат мяцежнікаў перайшлі на бок рэспубліканцаў.

Авіяцыя рэспубліканцаў бамбардыравала чыгуначную станцыю Хадраке (гвадалахарскі ўчастак).

(БЕЛТА).

Германія прадаўжае пасылаць мяцежнікам войскі і зброю

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 23 мая. (БЕЛТА). Орган компартыі «Юманітэ» піша аб прадаўжаючайся адпраўцы з Германіі зброі і ваеннага снаражэння, прадназначанага для генерала Франко. Прадаўжаецца таксама і адпраўка спецыяльных войск у армію іспанскіх мяцежнікаў.

9 красавіка дапкі параход «Марыенберг» быў нагружан ваенным снаражэннем для генерала Франко. Выпадкова адна са скрынь, на якой была наклейка «шакалад», зламалася і з яе выпалі кулі «дум-дум». Гэта прыцягнула ўвагу партовых рабочых. Яны запікавіліся астатнім грузам і выявілі цэлую партыю танкаў і самалётаў-бамбардыроўшчыкаў, якія адпраўляліся ў разабраным выглядзе. Апрача таго ў красавіку германскае судно адправілася з Кіля з грузам у 100 танкаў, а таксама зенітных гармат і вялікай колькасці снаражэння.

У сярэдзіне месяца на гэта-ж судно было нагружана 450 германскіх салдат.

ПАЧАЎСЯ ПЕРШЫ ТЫРАЖ ПАЗЫКІ ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ

МАСКВА, 26 мая. (БЕЛТА). 25 мая ў Маскве, у тэатры народнай творчасці, ва ўрачыстай абстаноўцы адкрыўся першы тыраж пазыкі другой пяцігодкі (выпуск 4 года).

Старшыня тыражнай камісіі тав. Н. А. Булганін, абвяшчаючы першы тыраж пазыкі другой пяцігодкі адкрытым, адзначыў велізарную ролю совецкіх пазык у соцыялістычным будаўніцтве. Ён прывёў лічбы і факты, яркі ілюструючыя папулярнасць, якой карыстаюцца масавыя пазыкі сярод працоўных нашай краіны.

Учора была разыграна частка выйгрышаў. Тыраж заканчваецца 26 мая.

ПАРУШЭННЕ СОВЕЦКАЙ ГРАНІЦЫ ЯПОНА-МАНЧЖУРСКІМ АТРАДАМ

ХАБАРАЎСК, 26 мая. (БЕЛТА). Тут толькі што атрыманы весткі аб новым наглым парушэнні граніцы японска-манчжурскім узброеным атрадам. Сёння, у 13 гадзін 15 хвілін, наш пагранічны нарад у складзе 4 чырвонаармейцаў, які знаходзіўся на тэрыторыі СССР у раёне гранзнака № 18, к паўднёваму захаду ад Градэкава, на адлегласці звыш 1/2 кілометра ад граніцы, нечакана падвергся з дыстанцыі каля 50 метраў ружэйна-кулямётнаму абстрэлу са стараны японска-манчжурскага атрада колькасцю ў 15 чалавек, які ўварваўся на тэрыторыю СССР і прабаваў акружыць і захапіць нашых пагранічнікаў.

У рэзультаце энергічнага адпору ўварваўшыяся, не гледзячы на іх колькасную перавагу, былі адкінуты на манчжурскую тэрыторыю. Заслугоўвае быць адзначаным, што гэта дзёрзкая «аперацыя» прыкрывалася японска-манчжурскім атрадам колькасцю каля 50 чалавек, які заняў пазіцыю на самай граніцы і адкрыў агонь не толькі па названаму нашаму пагранічнаму нараду, але і па другому нараду, які, знаходзячыся ад першага на адлегласці каля кілометра, ішоў у напрамку да граніцы, прыцягнуты перастрэлкай, аднак, не паспеў прыняць у ёй удзелу. Перастрэлка прадаўжалася каля 15 хвілін. На месцы сутычкі, на совецкай тэрыторыі, нашымі пагранічнікамі было падабрана многа японскіх баявых патронаў і абойм.

АДКРЫУСЯ НАДЗВЫЧАЙНЫ ПЛЕНУМ ЛІГІ НАЦЫЙ

ЖЭНЕВА, 26 мая. (БЕЛТА). Сёння адкрыўся надзвычайны пленум Лігі нацый пад часовым старшынствам Кеведо (Эквадор — дзяржава ў Паўднёвай Амерыцы). Прысутнічаюць прадстаўнікі 50 дзяржаў.

Па дакладу мандатнай камісіі польскі дэлегат Камарніцкі зрабіў заяву, сэнс якой зводзіўся к таму, каб мандаты абісінскай дэлегацыі, калі яна з'явіцца на сесію Лігі, не былі зацверджаны.

Такім чынам, урад Польшчы зрабіў чарговы жэст у карысць адсутных прадстаўнікоў фашысцкага блока — Германіі і Італіі.

Дэлегат Мексікі Фабела, неадкладна ўзяўшы слова для заявы, сказаў: «Мексіка рашуча пратэстуе ўсякаму намеру падрыхтаваць глебу для выключэння дзяржавы, члена Лігі нацый, са складу Лігі».

Далей быў зацверджан даклад мандатнай камісіі, і тайным галасаваннем выбран старшынёй пленума міністр замежных спраў Турцыі Тэфік Рушдзі Арас. Па прапанове Араса зацверджан наступны парадак дня пленума: 1) прыняцце Егіпта ў Лігу нацый, 2) выбары аднаго члена гаагскага (Гаага — сталіца Галандыі) міжнароднага трыбунала. Затым пасяджэнне было спынена.

У г. Мозыры здан у эксплаатацыю пабудаваны рачны вакзал. Пры вакзале ёсць добры рэстаран, гасцініца, пакой маці і дзіцяці. НА ЗДЫМКУ: від вакзала з боку р. Прыпяці.

Фото І. Пікмана (БСФ).

ПАЛАТНЯНЫ ГОРАД

Лагер часці, якой камандуе тав. Сураўцаў, рыхтуецца да ганаровага ўзняцця сцяга—дня афіцыяльнага адкрыцця лагераў. Байцы і камандзіры чакаюць у госці працоўных раёна.

Лагер схаваўся ў густым ценю стройных соснаў. Лінейкі ўпрыгожаны яркай зеляніной маладых дрэў, кустамі кветак—клапатліва пасаджаных рукамі жонак камандзіраў. Невысокае пласкагор'е, дзе разбіт лагер, акружае серабрыстая лента быстрай звілістай рэчкі. У яе водах прыемна будзе выкупацца ў гарачыя летнія дзянёчкі пасля напружанай вучобы. Пяціметравая вышка для прыжкоў у ваду чакае плаўпоў.

Прыгожы лагерныя стадыёны. Сцены лесу акружаюць іх. Пад ценем соснаў хаваюцца лаўкі для гляцачоў. Вабіць вока роўная зеляніна футбольных пляцовак. Ля Дома Чырвонай Арміі, на ўзлеску раскінуўся парк. Пад кустамі ўтульна расстаўлены лаўкі.

Самы гарачы перыяд — лагерная вучоба. Пяжкія дні вучэбнаў, многакілометравыя паходы чакаюць байцоў. Гэта не страшыць. У лагеры можна добра адпачыць, загартавацца для пераможных схватак з ворагам.

Дзень урачыстага адкрыцця лагера байцы і камандзіры сустрэнуць першымі перамогамі на фронце летняй баявой вучобы. Гасцям—працоўным раёна—апрача кіпучай, жыццерадаснай, баявой чырвонаармейскай самадзейнасці, здзіўляючых спартыўных нумароў жыхары палатнянага горада: снайперы, кулямётчыкі, артылерысты, коннікі, танкісты пакажуць узоры віртуознага валодання баявой першакласнай тэхнікай, якой аснасціла Краіна Советаў сваю непераможную Чырвоную Армію.

П. ВАЛЬД.

ПІСЬМЕННІКІ ДА 20-ГОДДЗЯ КАСТРЫЧНІКА

Надыходзячую 20-ю гадавіну Кастрычніцкай рэволюцыі літаратура БССР сустрэне новымі творчымі дасягненнямі. Пісьменнікі, паэты, драматургі пішуць новыя творы, распрацоўваючы рознастайныя тэмы з часоў грамадзянскай вайны і з нашай сучаснай рэчаіснасці — пра новых людзей сталінскай эпохі.

У творчых планах значнае месца займае тэматыка грамадзянскай вайны па Беларусі. Платон Галавач напісаў даве аповесці пра барацьбу беларускага народу з белапольскімі акупантамі. Зараз тав. Галавач працуе над кнігай пра комсамол пад назвай «Дарога ў свет». У новай паэме «Палескі камітэт» М. Хведаровіч паказвае падзеі часоў грамадзянскай вайны і кіруючую ролю большэвіцкай партыі. Грамадзянскай вайне прысвечаны і новыя п'есы М. Кульбака, Рамановіча, В. Глазырына.

Народны паэт БССР Якуб Колас да 20-й гадавіны Кастрычніка закончыць паэму «На шляхах волі» і аповесць для нашых піонераў.

Многія пісьменнікі працуюць над сучаснай абаронай тэматыкай. Кузьма Чорны піша раман «Заваёва свету». І. Шамякін заканчвае другую частку вядомага чытачам рамана «Большэвікі граніцы». Пра мужных чырвоных пагранічнікаў Дальняга Ўсхода напісаў паэму А. Куляшоў «Васіль Баранаў».

Эдуард Самуйлёнак падрыхтаваў кнігу новых апавяданняў і праз некаторы час здае ў друк раман «Будучыня», урыўкі з якога друкаваліся на старонках нашага друку. Апрача таго т. Самуйлёнак заканчвае раман «Пагібель Воўка», над якім працуе трэці год.

Беларуская совецкая літаратура абагаціцца і новымі творамі. П. Броўка піша паэму «Кацярына»—пра лёс беларускай батрачкі — цяперашняй ордэнаноскі. П. Глебка заканчвае лібрэта оперы і падрыхтаваў да друку зборнік новых вершаў. Выйдуць з друку новыя кнігі вершаў народнага паэта БССР Янкі Купалы і Андрэя Александровіча.

Праўленне Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР і Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі павінны скласці ўсе ўмовы для рэалізацыі творчых планаў пісьменнікаў і своечасовага выдання новых кніг.

ЗАКРАСАВАЛА ЖЫТА

У самых паўднёвых калгасах Нараўлянскага раёна «Завет Леніна» і «Чырвоная Нічыпараўка» закрасавала азімае жыта. Жыта закрасавала на тры тыдні раней, чым у мінулым годзе. У гэтых калгасах на насенных і некаторых іншых участках жыта дасягае 2-х метраў росту.

КОСЯЦЬ СЕНА НА БАЛОЦЕ

ХОЙНІКІ (БЕЛТА). Соўгас «Перамога соцыялізма» пачаў касьбу балотнай сенажаці. Скошаны першыя 67 гектараў. У соўгасе адрамантаваны 2 трактарныя і 12 конных касілак. Касілкамі будзе скошана больш тысячы гектараў сенажацей.

ЗНАХОДКА СТАРАДАЎНІХ МАНЕТ

МОЗЫР. (Кар. «Звязды»). 23 мая гасніца сельгасарцелі «Чырвоны партыз (вёска Слабада, Мозырскі раён) Ру Тацьяна, ідучы па ўзаранаму полю, за жыла на раллі старыя сярэбраныя м ты рознай велічыні. Сабраўшы 118 ма яна прынесла іх дахаты. Назаўтра месца знаходкі (Урочышча Антонава ляна) накіраваўся былы рабочы соў «Слабада» Мулко Рыгор. Ён пачаў канваць зямлю лапатай. На невял глыбіні ім былі выкапаны чарапкі ста глінянага гаршка, а разам з імі каля сячы старадаўніх сярэбраных манет канкі 1623, 1627, 1644, 1647 і інш. г XVII стагоддзя. Усе манеты знойдзе грамадзянкай Рухло і гр. Мулко. — межнага паходжання. Рэдакцыя акруг газеты «Большэвік Палесся», куды з нуўся са сваёй знаходкай грамадз Мулко, паведаміла аб гэтай знахо Акадэміі навук БССР. Характэрна, на даным участку поля — гэта ўжо дзя па ліку знаходка старадаўніх ма

ПАСТАЯННЫЯ ЖЫХАРЫ Ў ГАСЦІНІЦЫ

Гасцініца ў м. Брагін заселена пас нымі жыхарамі. Прыязджаючыя ў ка дыроўкі не знаходзяць ніколі пач Цэлы год пражывае ў гасцініцы інст тар райкома партыі т. Лісаковіч, які займае вялікі пакой. Народны суддзя т рын таксама займае асобны пакой хоча яго пакінуць, хоць яму і прада лена кватэра. На працягу 5 мес Шорын не плаціць за гэты пакой кватэ платы. Брагінскі местачковы совет і нічога не прымаюць, каб разгрузіць г ніцу ад гэтых кватэрантаў.

ПРОТЧАНК

СПРАВА РАБОТНІКАЎ МІЖРАЁННАЙ БАЗЫ БЕЛКААПСАЮЗА

На працягу некалькіх год на меж міжраённай базе Белкаапсаюза твар розныя згіднасці і злачынствы з бок раўніцтва і работнікаў гэтай базы. Д тар базы Е. Э. Кліонскі і галоўны галтар Х. М. Еліоўскі злачынна адн ся да сваіх абавязкаў. Гэта давала чымасць прайдзісветам і жулікам крадваць дзяржаўныя грошы і тавар

Загадчык харчовым складам базы Гуткоўскі сістэматычна займаўся ра даннем тавараў і прысваеннем дзя ных грошай. У 1935 г. ім было пр на і растрачана 59130 р. 65 кап. У годзе — 135043 р. 18 кап. Для скр сваіх злачынстваў Гуткоўскі ствар складзе вялікія лішкі тавараў шляха дасылкі іх клієнтам, незаконных на на тавары і прадстаўленні фіктыўн кументаў. Так, за 1935 г. ён стварч шак на суму 29398 р. 83 к. За 1936 на 12121 р. 34 к.

Еліоўскі, ведаючы аб раскраданнях рабіліся на базе, утойваў іх. Ён дзіў няправільныя бухгалтарскія пра што давала магчымасць жулікам і дзісветам яшчэ больш раскрадаць ры. Таксама адсутнічаў улік тавар базе. Тавар прыходаваўся няправі пакрадзены Еліоўскім спісваўся. Толь 9 месяцаў базай спісана тавараў на 66 тысяч рублёў.

Каб пакрыць недастачу па раскра Кліонскі прыбягае да незаконнага шэння напэнак на тавары, ад якіх рымаў за 9 месяцаў 84.3 тысячы р На базе ўтвараліся таксама незак камерцыйныя крэдытаванні і авансі ні пастаўшчыкоў. Запазычанасць складае 890 тысяч рублёў. Аднак гропы ніхто нават і не цікавіўся напь.

Пракуратурай гор. Менска следст гэтай справе скончана. Справа накі Вярхоўнаму суду БССР на разгляд.

І.

Адказны рэдактар Д. В. ЮРКО

СЕННЯ Ў ТЭАТРАХ І КІНО:

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР (БДДТ) Абан. № 118. СКУПЫ

Памяшк. Дзярж. Яўрэйск. тэатра | БЕЛДЗЯРЖТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА Абан. № 48. ФЛОРЫЯ ТОСКА

Гукавы кінотэатр «Чырвоная зорка» ТРЫНАЦЦАЦЬ на летняй эстрадзе — канцэрт. аддз.

Гукавы кінотэатр «Пролетарый» «ЖАННІЬБА» (па Гогалю) на летняй эстрадзе — джаз-аркестр

Гукавы кінотэатр «Інтэрнацыянал» «ПЕТЭР»

Гукавы кінотэатр «Спартак» ГРАНІЦА

РАДЫЁПЕРАДАЧЫ НА 27 МАЯ: 8.30 — «Апошнія паведамленні». 16 — канцэрт. 17 — перадача для дзяцей. 18.30 — завочная партвучоба. 20 — гутарка аб Паўночным полюсе. 20.30 — літаратурная перадача на яўрэйскай мове. 21 — адкрыты канцэрт артыста-спевака А. І. Окаемава. 23 — «Апошнія паведамленні». 23.15 — «Апошнія паведамленні» на польскай мове.

РАДЫЁПЕРАДАЧЫ НА 28 МАЯ: 8.30 — «Апошнія паведамленні». 16 — казахская музычная п'еса «Кізкі Бэк». 17 — перадача для дзяцей. Якімовіч—«Каваль Вярнідуб». 18.30 — завочная партвучоба. 19.30 — рускія народныя песні.

У аддзел аб'яў званіце па тэл. 21-845

МЕНСКІ ГАРАДСКІ ФІНАНСАВЫ АДДЗЕЛ

ПРАПАНУЕ ўсім прадпрыемствам, установам і арганізацыям не пазней 5 чэрвеня 1937 года ПРАДСТАВІЦЬ у гарфа (вуліца Карла Маркса, 16, пакой 33, другі паверх)

СПРАВАЗДАЧУ АБ УТРЫМАННІ КУЛЬТЗБОРУ з рабочых і служачых і прыроўненых да іх асоб па зарплаце ЗА САКАВІК месяц гэтага года (па ўтрыманню зробленаму ў першай палове красавіка) па форме:

(назва ўстановы і арганізацыі)

(Адрас і № тэлефона) № . . . . . (№ рэгістрацыі)

СПРАВАЗДАЧА аб утрыманні культзбору з рабочых, служачых і прыроўненых да іх асоб па заработку за сакавік месяц 1937 года

Групы па размеру месячнага заработку	Колькасць асоб	Сума збору
Да 100 руб		
Ад 101 да 140 руб.		
Ад 141 да 150 руб.		
Ад 151 да 200 руб.		
Ад 201 да 250 руб.		
Ад 251 да 300 руб.		
Ад 301 да 350 руб.		
Ад 351 да 400 руб.		
Ад 401 да 450 руб.		
Ад 451 да 500 руб.		
Ад 501 да 550 руб.		
Ад 551 да 600 руб.		
Ад 601 да 700 руб.		
Ад 701 да 800 руб.		
Ад 801 да 900 руб.		
Ад 901 да 1000 руб.		
Ад 1001 да 1250 руб		
Ад 1251 да 1500 руб.		
Ад 1501 да 1750 руб.		
Ад 1751 да 2000 руб.		
Звыш 2000 руб.		
УСЯГО		

КІРАЎНІК УСТАНОВЫ. БУХГАЛТАР.

УВАГА. У справаздачу ўключаюцца весткі аб усіх асобах, якія працуюць у даным прадпрыемстве, установе і арганізацыі, у тым ліку і аб вызваленых ад абкладання па неабкладаемаму мінімуму.

МЕНГАРФА.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЮРЫДЫЧНЫ ІНСТЫТУТ абвяшчае НАБОР СТУДЭНТАЎ на 1937-38 навучальны год

Інстытут рыхтуе юрыстаў для работы ў судовых органах, органах пракуратуры, следства, органах натарыята, адвакатуры і арбітража з поўным, устаноўленым для гэтых катэгорый работнікаў, тэрмінам стажыроўкі пасля сканчэння інстытута.

Прыём заяў аб паступленні будзе праводзіцца з 20 чэрвеня да 1 жніўня. Тэрмін навучання 4 гады.

У інстытут прымаюцца асобы ад 17 да 35 год.

Паступаючыя ў інстытут павінны мець атэстат аб сканчэнні поўнай сярэдняй школы і здаць іспыты, згодна пастановы ЦК ВКП(б) і СНК СССР ад 23 чэрвеня 1936 года, па ніжэйказаных прадметах: а) рускай і беларускай мовах (пісьмовы твор). б) граматыцы, в) літаратуры, г) палітграмаце, д) матэматыцы, е) фізіцы, ж) хіміі, з) гісторыі, і) геаграфіі, к) замежнай мове (па адной з наступных: нямецкай, англійскай або французскай).

Асобы, якія скончылі да 1935 г. школу II ступені (дзесяцігодку) або 3-гадовыя на базе сямігодкі прафесіянальныя школы ў БССР і ў СССР, дапускаюцца да прыёмных іспытаў нарэўне са скончыўшымі дзесяцігодку.

Скончыўшыя дзесяцігодку і маючыя па асноўных прадметах адзнакі «выдатна», а па астатніх прадметах (маляванне, чарчэнне, спевы, музыка, фізкультура) адзнаку «добра», прымаюцца ў інстытут без іспытаў.

Да заявы павінны быць прыкладзены наступныя дакументы: аўтабіяграфія, атэстат аб сканчэнні сярэдняй навучальнай установы (у арыгінале), пашпарт (прад'яўляецца асабіста). 3 фотакарткі (здымкі без галаўнога ўбору), размерам 3х4 см, з уласнаручным подпісам паступаючага на кожнай з іх, заверанымі дзяржустановай, даведкі аб адносінах да ваеннай службы (для ваеннаабавязаных) даведка ад урача аб стане здароўя.

Усе студэнты забяспечваюцца, у залежнасці ад паспяховасці, стыпендыяй ад 90 да 200 руб у месяц. Сямейныя інтэрнатам не забяспечваюцца.

Прыёмныя іспыты адбудуцца з 1 па 20 жніўня. Залічэнне ў лік студэнтаў з 21 па 25 жніўня.

Асобы залічаныя ў юрыдычны інстытут, але без уважлівых прычын не прыступіўшыя да заняткаў в пачатку навучальнага года, з ліку студэнтаў выключаюцца.

Заявы падаваць на імя дырэктара юрыдычнага інстытута па адрасу: Менск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, юрыдычны інстытут, пакой 323. Тэл. № 753.

УВАГА: У гэтай аб'яве, змешчанай у газеце «Звязда» ад 26 мая 1937 г. № 119, дапушчана памылка: замест «ад 14 да 35 год» трэба чытаць «ад 17 да 35 год».

ЧЫРВОНАБЯРЭЖСКІ ТЭХНІКУМ АГРАМЕХАНІЗАЦЫІ абвяшчае НАБОР СТУДЭНТАЎ на 1 курс АГРАНАМІЧНАГА і МЕХАНІЧНАГА АДДЗЯЛЕННЯЎ.

Тэхнікум рыхтуе аграномаў-паляводаў і тэхнікаў-механікаў па аўтатрактарнай справе для сістэмы Нарк омсоўгасаў БССР і СССР.

У тэхнікум прымаюцца асобы ва ўзросце ад 16 да 30 год, якія маюць адукацыю ў аб'ёме НСШ. Паступаючыя надвяграюцца іспытам у аб'ёме праграм НСШ па рускай і беларускай мовах, матэматыцы, фізіцы, палітграмаце і геаграфіі. Асобы, скончыўшыя НСШ па асноўных прадметах на «выдатна», а астатнія на «добра» прымаюцца без іспытаў.

Прыём заяў да 15 жніўня, а іспыты — з 15 па 25 жніўня. Да заявы прыкладаюцца: аўтабіяграфія, пасведчанне аб сканчэнні НСШ (арыгінал), метрыка, справка аб здароўі, 2 фотакарткі, заверанымі дзяржустановай і марак на 40 кап. Пашпарт прад'яўляецца асабіста.

Пры тэхнікуме ёсць інтэрнаты, сталовая, кіно, вучэбная гаспадарка. Стыпендыя ад 57 руб. і вышэй па паспяховасці.

Заявы з дакументамі накіроўваць на імя дырэктара па адрасу: паштовае аддзяленне Чырвоны Берег, Жлобінскага раёна, тэхнікум аграмеханізацыі.

ДЫРЭКЦЫЯ.

У фінансавым кабінеце Наркамфіна БССР (Земляробчы заў лак, Інстытут народнай гасп адаркі, другі паверх, актавая зал

28 мая ў 19 гадзін адбудзе ецца лекцыя на тэму: „ПРАБЛЕМА ГРАШОВАГА ЗВАРОТУ Ў ПЕРШАЙ ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКАХ І НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ“

Лекцыю прачытае прафесар АТЛАС З. В. (Масква).

Запрашаюцца спецыялісты фінансава-крэдытнай сістэмы, вуковыя работнікі, студэнты ІНГ і ўсе асобы, якія цікавяцца тай лекцыяй.

ДЫРЭКЦЫЯ ФІНАНСАВАГА КАБІНЕТА.

НАРКОМПИЩЕПРОМ СССР ГЛАВКОНСЕРВ

У КАЖДОЙ ХОЗЯЙКИ В БУФЕТЕ и НА КАЖДОМ СТОЛИКЕ РЕСТОРАНА ДОЛЖНА СТОЯТЬ БУТЫЛКА КЕТЧУП

ТОМАТНЫЙ КЕТЧУП самая приятная, острая и ароматная ПРИПРАВА К МЯСНЫМ, РЫБНЫМ, ОВОЩНЫМ И МУЧНИСТЫМ БЛЮДАМ

кетчуп - это томатный соус, в состав которо входит, помимо томатного пюре, сахар, соль дестиллированный уксус, лук, свежепротер чеснок, перец, горчица, корица, гвоздика, мускатный орех, сельдерей, имбирь и др. специ

ТРЕБУЙТЕ КЕТЧУП ЗАВОДОВ ГЛАВКОНСЕР ВО ВСЕХ ПРОДУКТОВЫХ МАГАЗИНАХ

Уп. Галоўлітбела № К—2107. Друкарня газеты «Звязды». Менск, Совецкая, 63. К., К.,